ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 25 (4277)
Субота, 30 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 67

Пад сьцягам Леніна, згуртаваная як ніколі вакол свайго ЦК і правадыра УсесКП(б) і Камінтэрну тав. СТАЛІНА, маналітнымі і непахіснымі радамі бальшавіцкая партыя прышла да сваёй XVII партканфэрэнцыі.

XVII Усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі гарачае прывітаньне

СКОНЧЫЎ СВАЕ РАБОТЫ XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б

ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

28 раніцою працавалі камісіі. На вячэрнім пасяджэньні зьезд адналушна зацьвердзіў рэзалюцыі па справаздачы ЦК, ЦКК і па дакладу тав. Грысевіча.

Пасьля абраньня складу пленуму ЦК КП(б)Б, рэвізійнай камісіі і ЦКК, з вялікай заключнай прамовай выступіў першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО.

XIV зьезд КП(б)Б—гаворыць тав. Гікало,—прайшоў з выключнай дзела вітасьцю, прынцыповасьцю і сур'ёзнасьцю ў абмеркаваньні вынікаў і задач нашай работы.

Спрэчкі, што разгарнуліся па ўсіх дакладах, паказваюць аб высокім палітычным узроўні дэлегатаў зьезду і ўсіх бальшавікоў Беларусі. Яны — спрэчкі—паказваюць, што самакрытыка—гэта моцная зброя бальшавізму, прэнізала ўсю нашу работу.

КП(б)Б за мінулы перыяд праведзена вялікая работа, атрыманы гістарычнага значэньня перамогі. Але на паасобных вучастках ёсьць недахопы, прабелы і сур'ёзныя прарывы.

З усёй сілай, з наторам, улясьцівым бальшавіком трэба зараз налегчы на перамаганьне недахопаў, прарываў, сканцэнтраваць увагу кожнага камуніста выключнага на канкрэтных справах на ўсіх вучастках сацыялістычнай будоўлі.

XIV зьезд паказаў жалезную згуртаванасьць, маналітнасьць і адзінства радоў КП(б)Б.

Гэта дае вялікую ўпэўненасьць у тым, што дэлегаты зьезду, разьехаўшыся на месцы, разам з усёй арганізацыяй возьмуцца моцна за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за павышэньне тэмпаў загатовак, стварэньне магутнай энэргетычнай базы прамысловасьці, за вырашэньне другіх важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

XVII усесаюзная партканфэрэнцыя, якая заўтра пачынае сваю работу, будзе разглядаць карэнныя пытаньні будаўніцтва сацыялізму.

Канфэрэнцыя будзе зацьвярджаць плян другой пяцігодкі, акцыцыўленьне якога мае рашаючае значэньне для пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Наша работа ў 1932 годзе ў значнай ступені прадрашае посьпехі другой пяцігодкі.

Таму кожны дэлегат, кожны камуніст павінен да канца зразумець, што сёньняшні дзень яго работы забясьпечвае бальшавіцкія вынікі першай і стварае ўмовы для выканаьня другой пяцігодкі.

Мы павінны прыкладыць усе сілы, усесаюзнарыць бальшавіцкі напор, каб выканаць волю рабочай класы, волю ўсяе нашае партыі.

Камуністычная партыя бальшавікоў Беларусі, загартаваная ў барацьбе з правым і «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам, згуртаваная вакол ЦК УсеКП(б) і правадыра партыі тав. Сталіна, няўхільна ажыцьцяўляючы ленінізм, з гонарам выкача дыректывы партыі, будзе пасьпяхова будаваць сацыялістычнае грамадзтва.

Апошнія словы тав. Гікало пакрываюцца бурнымі апляўдысмантамі. Дэлегаты ўстаюць і сьпяваюць «Інтэрнацыянал».

XIV зьезд КП(б)Б абвяшчаецца закрытым.

* *

Пасьля закрыцьця зьезду адбыліся пленумы ЦК КП(б)Б і ЦКК, на якіх выбраны кіруючыя органы.

Наперад да новых перамог!

У гісторыю нашай барацьбы за сацыялізм упісана новая слаўная старонка. XIV зьезд бальшавікоў Савецкай Беларусі, які праходзіў напярэдадні XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, падагуліў вынікі сацыялістычнай будоўлі за перыяд ад XIII-га да XIV-га зьезду КП(б)Б і вызначыў нашы далейшыя задачы, нашы далейшыя шляхі ў барацьбе за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Багаты лічбамі і канкрэтнымі фактамі даклад тав. Шаранговіча даў разгорнуты малюнак тых перамог сацыялізму, якіх дабіўся пралетарыят вялікай савецкай краіны пад кіраўніцтвам партыі Леніна. Гэтыя перамогі ўзбройваюць усю нашу партыю, усю рабочую клясу і калгаснае сялянства яшчэ большай рэвалюцыйнай энэргіяй і энтузіязмам, мабілізуюць іх на далейшае пераможнае будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Кожная лічба прамфінплану 1932—заключнага году пяцігодкі,—гаварыў тав. Гікало на XIV зьезьдзе КП(б),—ёсьць лічба волі, энэргіі і бальшавіцкага напору. Кожная лічба нясе з сабой найвялікшыя тэмпы ў рабоце, кожная лічба павінна мець у сабе найвялікшую якасьць. Кожная лічба—гэта імкненьне перамагчы».

Дзе сьветы, дзьве сыстэмы стаяць адна супрэць другой. Сыстэма пераможнага сацыялізму і сыстэма пераможнага капіталізму. За чырвоным кардонам — далейшае катастрафічнае паглыбленьне крызісу, які ахапіў усе без выключэньня краіны капіталу. Жыцьцё з выключнай сілай пацьвердзіла словы тав. Сталіна, які ўказаў яшчэ на XIV зьезьдзе УсесКП(б), што сусьветны капіталізм стаіць на шляху няўхільнага абвастрэньня эканамічнага крызісу. Цяпер у жалезных абдымках крызісу задыхаюцца ўсе капіталістычныя дзяржавы. Назад буржуазныя эканамісты характарызуюць цяперашняе становішча капіталізму, як эпоху загніваньня капіталістычнай сыстэмы, як эпоху развалу асноўных падпор сусьветнага капіталізму.

Крызіс капіталізму набыў найбольш гострыя і глыбокія формы ў такіх краінах, як Польшча і акупаваная Зах. Беларусь. Тут вадучыя галіны прамысловасьці і сельскай гаспадаркі прышлі старальна да свайго поўнага заняпаду. Даволі ўказаць, што мэталюргічная, тэкстыльная і інш. прамысловасьці Польшчы загружаны зараз значна менш, чым на палову сваёй вытворчай магутнасьці.

На выратаваньне капіталізму мабілізуюцца ўсе сілы міжнароднай контрэвалюцыі — і жандары і паліцэйскія, і клярыкалы, і «сацыялісты», і фашысты, і збанкрутаваўшыя зброяносцы мінэтэра Троцкага. Невыпадкова прыхільнікі Гітлера адкрыта прызналіся, што яны «будуць вешаць, вешаць хаця-б па калёмі ў крыві. Кожны, хто скажа—няхай жыве Масква—будзе павешаны». Невыпадкова здрадник і актыўны спуж ка контр-рэвалюцыйнай буржуазіі — Троцкі бясспэнна закліча германскіх камуністаў да адзінага фронту з сацыял-фашысцкімі штрэйкбрэхэрамі пралетарскай рэвалюцыі. Не дапаможа. Рэвалюцыйная актыўнасьць сусьветнага пралетарыяту мацнее з дня ў дзень. Пралетары ўсіх краін, пад кіраўніцтвам нашых брацкіх камуністычных партый, пераходзяць у контр-наступленьне супрэць капіталу. Сусьветны пралетарыят усё больш пераконваецца, што толькі пад сьцягам Леніна, шляхам сацыялістычнай рэвалюцыі ён знойдзе па прыкладзе пралетараў СССР выхад са свайго цяперашняга становішча. Рабочыя масы на справе бачаць, што шлях мірнага супрацоўніцтва з капіталам, за які з апошніх сіл агітуюць сацыял-фашысцкія лёкаі буржуазіі, ёсьць шлях палітычнага разьбраньня рабочай клясы, ёсьць шлях закабаленьня і поўнага падпарадкаваньня пралетарыяту яго эксплёататарам. Здраднічая тэорыя і практыка сусьветнага апартунізму з усёй ясанасьцю паказала, што «апартуністы—гэта буржуазныя ворагі пралетарскай рэвалюцыі» (Ленін).

Міжнародны капіталізм імкнецца знайсьці выхад з тупіка, у які ён зайшоў, у падрыхтоўцы новых войнаў і ў першую чаргу ў вайне супрэць рэспублікі Саветаў. Не сакрэт, што вайна на акрываўленых палёх Манчжурыі, ёсьць непасрэдная падрыхтоўка сусьветнага імпэрыялізму да вялікай антысавецкай вайны. XIV зьезд КП(б)Б завастрыў увагу ўсіх партарганізацый, усіх камуністаў на задачах ДАЛЕЙШАГА ЎМАЦАВАНЬНЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ нашай краіны, умацаваньня нашай слаўнай Чырвонай арміі. Цьвёрда праводзячы папітыку міру, мы павінны быць гатовымі ў любую мінуту даць адпор імпэрыялістычным дрэпежнікам, калі яны паспрабуюць напасьці на Савецкі Саюз і яго фарпост—БССР.

На фоне гіганцкага крызісу сусьветнага капіталізму, ва ўсёй сваёй вышыні паўстаюць перамогі сацыялістычнага будаўніцтва, заваяваньня ленінскай партыяй у нашай краіне. У 1920 г. Ленін пісаў, што «лакаленьне, якому цяпер 15 год., праз 10-20 год будзе жыць у камуністычным грамадзтве». Бальшавіцкімі тэмпамі наша партыя вядзе краіну пралетарскай дыктатуры па шляху да ажыцьцяўленьня гэтых словаў тав. Леніна. Пераможна завершана пабудова фундамэнту сацыялістычнай эканомікі. Ленінскае пытаньне «хто кага» вырашана на тольк! ў прамысловасьці, але і ў сельскай гаспадарцы канчаткова на карысьць сацыялізму. Наша партыя стварыла адзіную базу сацыялізму—буйную цяжкую Індустрыю, на аснове якой у другой пяцігодцы будзе завершана сацыялістычная рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі. У вёсцы канчаткова падарвана карэньні капіталізму. Цяпер ужо ня дробны індывідуальны сэктар, які нараджае стыхійна і ў масавым маштабе капіталізм і буржуазію, ажрэсьнівае твар сельскай гаспадаркі. Цяпер абсалютную перавагу ў сельскагаспадарчай эканоміцы заваяваў сацыялістычны сэктар, заваявалі калгасы і саўгасы. Цэнтральнай фігурай элы пярэдства стала калгаснае сялянства. У тэзісах т. т. Мопатава і Куйбышэва да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі воюўнай палітычнай задачай другой пяцігодцы пастаўлены «канчаткова ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў ізагул, паўнае зьнішчэньне прычын, якія нараджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю, перамога над перажыткамі капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва нашай краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў Бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Гэтыя сусьветна-гістарычныя перамогі сацыялізму да прышлі да нас самацёкам. Яны заваяваны нашай партыяй пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК УсесКП(б) на чале з першым ленінцам т. Сталіным. Наша партыя ўшчэнт разграміла контр-рэвалюцыйны трацкізм. Наша партыя разьбіла правую апазыцыю ў сваіх радох. Згуртаваная вакол свайго Цэнтральнага Камітэту і тав. Сталіна, наша партыя непрымірыма змагалася і змагаецца за ленінізм, за сваю генэральную лінію, супрэць правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва, супрэць трацкісцкіх кантрабандыстаў і гнілых лібералаў.

XIV зьезд канстатаваў, што КП(б)Б —верная гвардыя ленінскай партыі— забясьпечыла вялікія перамогі на ўсіх франтох гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР. Пралетарыят БССР разам з працоўнымі масамі сялянства, пры брацкай дапамозе Савецкага Саюзу, ператварыў Беларусь пад кіраўніцтвам КП(б)Б з адсталай і прыгнечанай у мінулым капоніі царызму ў фарпост сацыялістычнага будаўніцтва на рубяжы з капіталістычным Захадам. БССР становіцца краінай разьвітай прамысловасьці, краінай разьвітай сацыялістычнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Толькі ў мінулым годзе валавая прадукцыя прамысловасьці БССР вырасла на 69 проц. Уступілі ў строй новыя індустрыяльныя прадпрыемствы. Значна вырасьлі рады рабочай клясы. Мы дасягнулі нясумненных посьпехаў у галіне далейшага паглыбленьня матар'яльна - бытавога абслугоўваньня рабочых і працоўных мас. Праведзена вялікая работа па разгортваньні савецкага гандлю, рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі і г. д.

Тав. Сталін на XIV зьезьдзе партыі ўказаў, што пэрыяд дыктатуры пралетарыяту ёсьць пэрыяд набывалага росквіту нацыянальных культур, сацыялістычных па сваім зьмесьце. Посьпехі, заваяваныя КП(б)Б у барацьбе за ленінскую нацыянальную палітыку, з вычарпальнай сілай пацьвярджаюць гэтыя словы. БССР ператвараецца ў рэспубліку суцэльнай пісьменнасьці. Нацыянальная па форме і пралетарская па зьмесьце беларуская культура і культура працоўных нацменшасьцяй узьняліся на нябывалую вышыню. КП(б)Б мабілізуе масы на далейшую, яшчэ больш глыбокую рашучую барацьбу за беларусізацыю, за вывучэньне гісторыі эканомікі і культуры Беларусі, за разгортваньне найшырэйшай работы сярод працоўных нацменшасьцяй.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што КП(б)Б была імэнна тэй арганізацыяй нашай партыі, якая «не на словах, а на справе змагалася за генэральную лінію партыі і няўхільна праводзіла гэту лінію ў жыцьцё» (Гікало).

XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б АДНАДУШНА ПРЫЗНАЎ ПАЛІТЫЧНУЮ ЛІНІЮ ЦК І ЦКК КП(б)Б ПРАВІЛЬНАЙ І ІХ ПРАКТЫЧНУЮ РАБОТУ ЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ.

XIV зьезд бальшавікоў Савецкай Беларусі прайшоў пад знакам разгорнутай крытыкі і самакрытыкі. Зьезд з усёй бальшавіцкай рашучасьцю выкрыў сур'ёзныя недахопы, якія мяюць месца ў нашай практычнай рабоце. Прамысловасьць БССР, ня гледзячы на вялікі рост параўнальна з мінулым годам, усё-ж свой прамфінплян НЕДАВЫКАНАЛА. Вытворчая праграма 1931 г. выканана ўсяго толькі на 79,9 проц. Асабліва нездавальняючыя вынікі ў галіне выкананьня якасных паказьнікаў. Нельга яшчэ прызнаць здавальняючай таксама нашу работу па арганізацыйна-гаспадарчым ўмацаваньні калгасаў. У прыватнасьці яшчэ невыстарчальны тэмпы і якасьць будаўніцтва жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых гаспадарак.

Зьезд з усёй сілай падкрэсьліў, што асноўнай прычынай гэтых недахопаў зьяўляецца яшчэ СЛАБАЯ, ЗУСІМ НЕВЫСТАРЧАЛЬНАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ 6 гістарычных умоў перамогі—6 указаньняў тав. Сталіна. Нашы многія арганізацыі, яшчэ не разгарнулі бальшавіцкай барацьбы за ажыцьцяўленьне гэтых указаньняў. Корань зла—у слабай перабудове работы, у невыстарчальна рашучым выкананьні пёзунгу—«працаваць і кіраваць па-новаму». Замест сапраўднай бальшавіцкай перабудовы партыйна-масавай работы, мы маем часта голыя абяцаньні, пустую і бескарысную гульню ў прыгожыя рэзалюцыі, шкодную дэкларацыйнасьць. Ня цяжка ўбачыць, што за такой дэкларацыйнасьцю, за такімі голымі закліканьнямі замест сапраўднай перабудовы, хаваецца апартунізм на практыцы.

Грандыёзная праграма 1932 году можа быць выканана толькі тады, калі мы на справе, па-бальшавіцку, з усім рэвалюцыйным напорам, воляй і энэргіяй, канкрэтна і апэрацыйна ажыцьцёсім на практыцы 6 умоў тав. Сталіна. «Мы павінны дабіцца таго, каб 6 гістарычных умоў тав. Сталіна былі ажыцьцёўлены не рэзалюцыямі, ня словамі, а справай. Просьцей, за ўсё прыняць вялікую рэзалюцыю і гэтай рэзалюцыі ня выканаць. 6 гістарычных умоў тав. Сталіна трэба праводзіць канкрэтна і апэрацыйна, тр з змагацца за іх праведзьненьне на ўсіх вучастках работы» (Гікало).

Задача заключаецца ў тым, каб на справе дабіць абязьлічку і ўраўнілаўку, укараніць гаспадарчы разрахунак, каб сапраўды перабудаваць работу ўсіх арганізацый, кожнага камуніста і гаспадарніка ў адпаведнасьці з новымі задачамі. ГАЛОЎНЫ УПОР — НА ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ, на поўнае выкананьне ўсіх да аднаго якасных паказальнікаў. Праблема якасьці работы і кіраўніцтва—рашаючая праблема пэрыяду сацыялізму.

Асабліва значэньне набываюць пытаньні рабочага быту, рабочага снабжэньня, пытаньні культурна-бытавога абслугоўваньня найшырэйшых рабочых мас. Трэба раз назаўсёды пакончыць з апартуністычнымі пагардлівымі адносінамі да дробязяй рабочага быту. Зьезд патрабаваў ад усіх партарганізацый сапраўды бальшавіцкай работы па канкрэтным паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы і па рэканструкцыі камунальнай гаспадаркі. Трэба шырэй і глыбей разгарнуць савецкі гандаль, рашуча выкараняючы «нэпманскі дух» і «пявацкіх» прапаведнікаў простага прадуктаабмену, трэба на справе перабудаваць усю работу кааперацыі тварам да рабочага спажыўца.

Падкрэсьліваючы выключнае значэньне праблемы кадраў для нашага сацыялістычнага будаўніцтва, XIV зьезд КП(б)Б заклікаў усе партыйныя арганізацыі дэлегатаў зьезду і ўсіх бальшавікоў Беларусі. Яны — спрэчкі—паказваюць, што самакрытыка—гэта моцная зброя бальшавізму, прэнізала ўсю нашу работу.

Падкрэсьліваючы выключнае значэньне праблемы кадраў для нашага сацыялістычнага будаўніцтва, XIV зьезд КП(б)Б заклікаў усе партыйныя арганізацыі да далейшай, яшчэ больш упартай барацьбы за стварэньне ўласнай вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі рабочай класы.

XIV зьезд даў разгорнутую праграму ліквідацыі адставаньня нашага транспарту ад агульных тэмпаў сацыялістычнай будоўлі. Задача партыйных арганізацый гэту праграму поўнасьцю ажыцьцявіць.

У галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі перад намі стаіць задача—разгарнуць яшчэ больш напружаную і ўпартую барацьбу за вырашэньне цэнтральнай праблемы — калгаснага будаўніцтва — арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Галоўнае ў тым, каб па-бальшавіцку арганізаваць калгасную вытворчасьць на аснове рэалізацыі 6 указаньняў тав. Сталіна, паставіўшы ў цэнтр увагі якасьць работы. Галоўнае ў тым, каб канкрэтна і апэрацыйна на ўсіх вучастках калгаснай вытворчасьці ажыцьцявіць дырэктывы аб уздыме ўраджайнасьці, аб аўпаданьні агратэхнікай і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Узмацняючы барацьбу з буржуазна-рэакцыйнымі тэндэнцыямі, неабходна дабіцца найхутчэйшага выкананьня ўсіх загатоўчых плянаў і асабліва па ільне.

У галіне жывёлагадоўлі і тэхнічных культур тэмпы і ў першую чаргу якасьць работы трэба крута і рашуча ўзьняць уверх. Мы павінны працаваць такімі тэмпамі і з такой якасьцю, каб у другой пяцігодцы поўнасьцю вырашыць жывёлагадоўчую праблему і праблему тэхнічных культур. XIV зьезд абавязаў усе арганізацыі не асабліваць барацьбы з «лявацкай» пагоняй за дутымі процантамі налектывізацыі.

КП(б)Б за парыяд ад XIII-га да XIV-га зьезду значна вырасла. Вырас і ленінскі камсамол. Адным, рост нашых партарганізацый за ліч карэнных пралетараў праходзіць невыстарчальна. Многія партгрупы на прадпрыемствах не разгарнулі адпаведнай масавай работы. Адсюль задача ўмацаваньня нізавога зьвяна нашай партыйнай арганізацыі—ячэйкі і партгрупы, асабліва ўмацаваньня яго кіраўніцтва.

Зьезд прызнаваў увагу ўсёй КП(б)Б да задач далейшай барацьбы за марксыцка-ленінскае выхаваньне партыйных мас і ў першую чаргу новага папаўненьня радоў партыі, мабілізуючы іх на барацьбу з правымі апартуністамі — носьбітамі галоўнай небясьпекі з «левымі» апартуністамі і прымірэнцамі, з трацкісцкай кантрабандай і гнілым лібералізмам.

Зьезд поўнасьцю ўхваліў пастановы бюро ЦК і прэзыдыуму ЦККК аб узмацненьні барацьбы з ухілам ў нацыянальным пытаньні. Задача ўсіх партарганізацый заключаецца ў тым, каб і надалей непрымірыма змагацца за ленінскую нацыянальную палітыку, супрэць усіх і ўсякіх ухілаў у нацыянальным пытаньні і ў першую чаргу супрэць ухілаў да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі.

Зьезд аднадушна ўхваліў тэзісы да ўсесаюзнай партканфэрэнцыі, якая сёньня адкрываецца.

XIV зьезд паказаў, што бальшавікі Савецкай Беларусі былі, ёсьць і будуць вернымі маналітнымі атрадам ленінскай партыі згуртаваным вакол ЦК УсесКП(б) і правадыра нашай партыі тав. Сталіна. Пад кіраўніцтвам ЦК УсесКП(б), на чале з тав. Сталіным, КП(б)Б дабіцца найвялікшых перамог на ўсіх франтох сацыялістычнай будоўлі БССР. Пад гэтым-жа выпрабаваным ленінскім кіраўніцтвам КП(б)Б, змагаючыся з правым і «левым» апартунізмам і прымірэнцтвам, павядзе рабочую клясу і калгаснае сялянства БССР наперад па шляху, да стварэньня бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

ДА 10-ЦІГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ САЦЫЯЛЬНАГА СТРАХАВАНЬНЯ

ПРЫВІТАНЬНЕ тав. ГАЛАДЗЕДА

У той час, як ва ўсім капіталістычным сьвеце становішча рабочае клясы з кожным днём пагоршваецца, расьце паўпарызм і беспрацоўе, у краіне Саветаў мы маем бесьперапынны ўзьдым становішча рабочых і ўсяго працоўнага насельніцтва.

На аснове ажыцьцяўленьня бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва мы маем ліквідацыю беспрацоўя і вялізарны рост дабрабыту і культурнага ўзроўню рабочых, усіх працоўных БССР і ўсяго Савецкага Саюзу.

Гэтаму росту мы абавязаны перш за ўсё цэлкіхлай барацьбе пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту камуністычнай партыі на чале з тав. Сталіным, за генэральную лінію ленінскай партыі і з усякімі ахілешыкамі ад яе.

Сацыяльнае страхаваньне, дзесьцігодзьдзе якога зараз адзначаецца, зьяўляецца адным з найлепшых заваяваньняў Кастрычніцкай рэвалюцыі.

За час свайго існаваньня сацыяльнае страхаваньне мае вялізарныя посьпехі ў справе абслугоўваньня дабрабыту рабочай клясы. Бюджэт сацыяльнага страхаваньня, колькасьць застрахаваных з кожным годам павялічваецца.

Упягненьне ў прамысловасьць новых значных капраў рабочых, новыя вялізарныя задачы, пастаўленыя партыяй і ўрадам у чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі, задачы другой пяцігодкі, якая зьявіцца вялізарнай гістарычнай эпохай чалавецтва, патрабуюць перабудаваньня работы органаў сацыяльнага страхаваньня ў напрамку найбольш шырокага абслугоўваньня патрэб рабочых, у першую чаргу рабочых вядучых галін прамысловасьці і ўдарнікаў у апавядзеньні з ростам матар'яльна-культурных патрэб рабочае клясы і працоўных. Сацыяльнае страхаваньне павінна зьявіцца магутным сродкам у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Вітаючы рабочых, работніц і ўсіх працоўных з дзесьцігодзьдзем сацыяльнага страхаваньня ўпэўнены у тым, што сацыяльнае страхаваньне ў БССР выканае тыя вялізарныя задачы, якія перад ім пастаўлены.

ГАЛАДЗЕД.

Склад кіруючых органаў КП(б)Б, выбраных XIV зьездам

ЧЛЕНЫ ЦК КП(б)Б

1. Аранштам.
2. Амбражунас.
3. Ашаровіч.
4. Бэнзк.
5. Балцін.
6. Баскін.
7. Бэрзін.
8. Барысевіч.
9. Бастанава.
10. Браўковіч.
11. Балашоў.
12. Бондараў.
13. Бутар.
14. Вансоўскі.
15. Васэрман.
16. Валахнянскі.
17. Заўковіч.
18. Валодзьна.
19. Васільлева.
20. Віслоўх.
21. Гікало.
22. Галадзед.
23. Гантман
24. Гарын.
25. Горын.
26. Грысевіч
27. Гітліна.
28. Гаруновіч.
29. Гурэвіч Л.
30. Грыбаў.
31. Герцовіч.
32. Дубіна.
33. Дукельскі.
34. Дзічкоўскі.
35. Дрэйман.
36. Жалкевіч.
37. Жыракоў.
38. Жуковіч.
39. Жыткоўскі.
40. Жыўцоў.
41. Зіноўеў.
42. Іваноў.
43. Кавальчук.
44. Калодка.
45. Каменштэйн.
46. Кудзелька.
47. Канавалаў.
48. Кухаркін.
49. Кіштымаў
50. Клімчук.
51. Камаеў.
52. Качук.
53. Крыпец.
54. Каган.
55. Курыловіч.
56. Кацизльсон.
57. Канашонак.
58. Ляўкоў.
59. Лакціёнаў.
60. Лысенкаў.
61. Матсон.
62. Мінюкоўскі.
63. Міцькоў.
64. Малашонак.
65. Масюкоў.
66. Мядзьведкін.
67. Мышалаў
68. Навіцкая.
69. Новікава.
70. Платун.
71. Плятнёў.
72. Пыжыкаў.
73. Палякоўскі.
74. Паўловіч.
75. Рачыцкі.
76. Разумаў.
77. Рыскін.
78. Рыжоў.
79. Розін.
80. Русанаў.
81. Рындзін.
82. Рэвякоў.
83. Рыўкіна.
84. Рубінская.
85. Саевіч.
86. Скараход.
87. Суданоў.
88 Соскін.
89. Сафронаў.
90. Супрун.
91. Сподрын.
92. Самусенка.
93. Сакалоўскі.
94. Тамашэўскі.
95. Трэцьцякова.
96. Убарэвіч.
97. Угорыц.
98. Фрумкін.
99. Хацкевіч.
100. Хаскін.
101. Хлеўнікаў.
102. Хімакоў.
103. Цімашэнка.
104. Чарвякоў.
105. Чарнышоў.
106. Чарнушэвіч.
107. Чарнабыльскі.
108. Шаранговіч.
109. Швайка.
110. Шапіра.
111. Шамшураў.
112. Шпэктараў.
113. Шоламаў.
114. Шапачнікаў.
115. Шулькін.
116. Шатрун.
117. Яўсеенка.

КАНДЫДАТЫ Ў ЧЛЕНЫ ЦК КП(б)Б

1. Аксючыц
2. Бялуга
3. Багданаў
4. Багачоў
5. Будкеўскі
6. Батва
7. Бойка
8. Генкін
9. Гофман
10. Дунец
11. Ефіменка
12. Звагельскі
13. Залатухін
14. Кац
15. Клімковіч
16. Казачок
17. Клыс
18. Ківерцаў
19. Краляевецкі
20. Карвеўскі
21. Капанеўскі
22. Кроль
23. Курынсон
24. Кароль
25. Лісковіч
26. Ластоўскі
27. Лянько
28. Міленькі
29. Нафедаў
30. Плаўнік
31. Падшывалін
32. Папенькаў
33. Подлас
34. Плешакоў
35. Рыжыкаў
36. Рэзьнікаў
37. Рубін
38. Смушкевіч
39. Сакаленка
40. Сафонаў
41. Тарасаў
42. Тарасаў
43. Трач
44. Тарасевіч
45. Фальдман
46. Фрыдбург
47. Цэнцыпер
48. Шпак
49. Шпак
50. Шніпман
51. Шэвелева
52. Юшны
53. Эпштэйн
54. Яршоў
55. Янковіч
56. Якаўлеў

РЭВІЗІЙНАЯ КАМІСІЯ

1. Арашчук
2. Вайзагер
3. Вайновіч
4. Войтаў
5. Драйчук
6. Каршакевіч
7. Кудзельскі
8. Левін
9. Новікаў
10. Самсоненка
11. Ярмаеў

ЧЛЕНЫ ЦКК КП(б)Б

1. Адамовіч
2. Азаронак
3. Аверын
4. Арлоў
5. Арндт
6. Біге
7. Бэрзін
8. Бярговін
9. Бэркеш
10. Беленькі
11. Бэргер
12. Бялычэнка
13. Блоўштэйн
14. Барвенкова
15. Бароўская
16. Бандарчык
17. Гурэвіч
18. Горшман
19. Гінлякевіч
20. Глезераў
21. Госін
22. Гусеў
23. Гольдман
24. Гроцкая
25. Гайсін
26. Вонзэль
27. Вочэтаў
28. Вярыга
29. Вежык
30. Дамброўскі
31. Дзейка
32. Домараў
33. Дакука
34. Жолудаў
35. Жмырко
36. Зябкін
37. Зінковіч
38. Зарамбскі
39. Закоркін
40. Зубрыцкі
41. Зомберг
42. Зак
43. Іванов
44. Іванічаў
45. Іофэ
46. Калнін
47. Касачонак
48. Кондратль
49. Кенігс
50. Кавалёў
51. Кваскоў
52. Катлярскі
53. Кракаў
54. Каган
55. Касьпер
56. Любімаў
57. Лазоўскі
58. Левін С.
59. Ласман
60. Ліпман
61. Лехэрзак
62. Мунцаў
63. Мураўёў
64. Міруц
65. Манжалей
66. Мацьвеў
67. Маслоўскі
68. Мельнгаў
69. Мальцава
70. Масюкоў
71. Мітлін
72. Марусевіч
73. Мінкус
74. Нафіокайцін
75. Пасюковіч
76. Прусакова
77. Пішчыкава
78. Палянскі
79. Прэдзіт
80. Патапаў
81. Прорвіч
82. Пашкеў
83. Пятупкоў
84. Рэвінскі
85. Рубінчык
86. Ракасоўскі
87. Рудзецкая
88. Розэнберг
89. Рофгін
90. Рэдэр
91. Рабкін
92. Равінаў
93. Суханова
94. Скаўронак
95. Сыпятняк
96. Серпін
97. Скрыбунас
98. Сідаровіч
99. Стабін
100. Станкевіч
101. Сапронава
102. Сьвярыцаў
103. Сьвярдлова
104. Сіманоўскі
105. Турлай
106. Трыона
107. Тарузінскі
108. Федаровчык
109. Хаскін
110. Хайтовін
111. Хатасевіч
112. Хіжынкаў
113. Хаўкін
114. Ціхановка
115. Чынцін
116. Чарнецкі
117. Шкірыч
118. Шабардзін
119. Эгле
120. Юдэльсон.

Першы пленум ЦК КП(б)Б

Учора пасьля закрыцьця зьезду адбыўся першы пленум выбранага XIV зьездам КП(б)Б Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі бальшавікоў Беларусі.

У склад бюро ЦК КП(б)Б аднагалосна выбраны: т. т. ГІКАЛО, ШАРАНГОВІЧ, ІВАНОЎ, РЫСКІН, ГАЛАДЗЕД, ЧАРВЯКОЎ, КАВАЛЬЧУК, РЫЖОЎ, БЭНЗК, МАТСОН, РАЧЫЦКІ, ГРЫСЕВІЧ, ЧАРНУШЭВІЧ, ГАНТМАН, УБАРЭВІЧ, АРАНШТАМ, ХЛЕЎНІКАЎ. Кандыдатамі ў члены бюро: т. т. МІЦЬКОЎ, СУДАКОЎ, ХАЦКЕВІЧ.

Першым сакратаром ЦК КП(б)Б выбран тав. ГІКАЛО, другім сакратаром выбран тав. ШАРАНГОВІЧ, сакратаром (па транспарту)—т. ІВАНОЎ, сакратаром (па снабжэньні)—т. РЫСКІН.

У сакратарыят ЦК КП(б)Б выбраны т.т. ГІКАЛО, ШАРАНГОВІЧ, ІВАНОЎ, РЫСКІН І ГАЛАДЗЕД.

Кандыдатамі т. т. РЫЖОЎ, ГАНТМАН, ЧАРНУШЭВІЧ І КАВАЛЬЧУК.

Пленум зацьвердзіў: загадчыкам аргаддзелу т. ГАНТМАНА, загадчыкам Культпропу т. ЧАРНУШЭВІЧА, загадчыкам Агітмасавым аддзелам т. ГАРУНОВІЧА, загадчыкам аддзелам кадраў т. КУХАРКІНА.

Рэдактарам органу ЦК КП(б)Б «ЗЬВЯЗДА» зацьверджан т. ГАРЫН.

Дэлегатамі на XVII усесаюзную партканфэрэнцыю выбраны: т. т. ГІКАЛО, ШАРАНГОВІЧ, ГАЛАДЗЕД, КАЛНІН, КАВАЛЬЧУК, ХЛЕЎНІКАЎ, СУДАКОЎ, РЫЖОЎ, КУРЫЛОВІЧ, УБАРЭВІЧ, АРАНШТАМ, ГРЫСЕВІЧ.

Пленум ЦКК КП(б)Б

Першы пленум ЦКК КП(б)Б, які адбыўся ўчора вечарам, аднагалосна, пад воплескі, выбраў старшынёю ЦКК тав. КАЛНІНА і сакратарамі партканалегіі т. т. ДАМБРОЎСКАГА і СУХАНАВУ.

Прэзыдыум выбран у складзе 15 чалавек: т. т. КАЛНІНА, ТУРЛАЯ, ГУРЭВІЧА, ЖОЛУДАВА, РЭВІНСКАГА, ДАМБРОЎСКАГА, СУХАНАВАЙ, КАЗАЧОНКА, КЕНІГА, ВОТЧЫТАВА, ЗЯБКІНА, КАВАЛЁВА, АВЕРЫНА, ГНІЛЯКЕІЧА І КВАСКОВА.

Кандыдатамі ў члены прэзыдыуму выбраны т. т. БЛАЎШТЭЙН і НАЎІОКАЙЦІС.

Пленум выбраў партканалегію ў складзе 17 чалавек: т. т. КАЛНІНА, ТУРЛАЯ, ГУРЭВІЧА, РЭВІНСКАГА, ЖОЛУДАВА, ДАМБРОЎСКАГА, СУХАНАВАЙ, ВОТЧЫТАВА, ЛІПМАНА, ПАСЮКЕВІЧА, АВЕРЫНА, БЛАЎШТЭЙНА, ПРУСАКОВА, СЕРПІНА, АРЛОВА, СЬЦЕПНЯКА І БІГЕ.

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

Спрэчкі па справаздачы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Прамова тав. Кавальчука

І КП(б)В дабілася вялікарымх посьпехаў на ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам няўхільнага асьнцьцяўленьня генеральнай лініі партыі, ленінская нацыянальная палітыкі.

Тав. Шаранговіч у сваім дакладзе патлумачыў асноўныя задачы, над выкананьнем якіх прыдзецца працаваць усёй КП(б)В пасьля XIV зьезду. Я спынюся на некаторых пытаньнях работы прамысловасьці і пытаньнях камунальнай гаспадаркі.

Вядомна, што ў рабоце прамысловасьці ёсьць рад дасягненьняў. Валавая прадукцыя прамысловасьці ў адносінах да ўсёй валавой прадукцыі народнай гаспадаркі БССР узрасла з 36 да 53 проц. у 1931 годзе. Адзнак, той факт, што прамфінплян за 1931 год выканан усяго на 84 проц. сьведчыць аб тым, што мы недастатковна перабудавалі сваю работу, не навучыліся яшчэ працаваць па новаму, ня выканалі поўнасьцю 6 гістарычных умоў тав. Сталіна.

На Менску гадавы план за 10 месяцаў выкананы усяго на 66,6 проц. Калі перавесьці гэта на тоны, ды атрымаецца, што толькі **Менская прамысловасьць недадала дзяржаве звыш чым на 17 млн. руб.** прамысловай прадукцыі.

Прычына недавыкананьня крыецца ў тым, што прамысловасьць зьнізу да верху недастатково перабудавала сваю работу на новаму. Гаспадарчыя аб'яднаньні, у тым ліку і сам ВСНГБ, яшчэ працуюць па-старому. На Менскай гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі гаспадарнікі, працаўнікі аб'яднаньняў мала выступалі, не паказалі, як яны мяркуюць далей перабудаваць работу, змагаецца з імі асноўнымі недахопамі, якія ёсьць на сённяшні дзень.

На бюро Менскага гаркому стаяла пытаньне аб фабрыцы «Беларуска». У дырэктара аб'яднаньня спыталіся — якая праграма гэтай фабрыкі, колькі ёсьць рабочых, колькі выканан прамфінплян. Дырэктар, які мае ў Менску адну фабрыку, сам разам з усім апаратам знаходзіцца ў Менску, на мяжы адказаць на пастаўленыя яму пытаньні. Гэта сьведчыць аб тым, колькі яшчэ многія гаспадарчыя аб'яднаньні перабудавалі сваю работу ў напрамку штодзённага аператыўнага кіраўніцтва.

Аб выжоньні сабекошту і якасьці прадукцыі. Дырэктыва партыі аб зьніжэньні сабекошту выканана толькі на 1,8 проц. Замест зьніжэньня сабекошту і паляпшэньня якасьці прамысловай прадукцыі яшчэ не пастаўлена ў цэнтры ўвагі работы гаспадарчых арганізацый, кожнай фабрыкі і заводу ў паасобку. Да справаздачы на гарадзкой партканфэрэнцыі мы прасілі даслаць нам лічбы аб выкананьні якасных паказальнікаў на 1931 год. Цікава, што ні адно гаспадарчае аб'яднаньне гэтых паказальнікаў на мяжу, і не даслала іх нам.

За якасьць, як сьлед, не змагаліся кіраўнікі заводаў, асабліва многія цэнтральныя арганізацыі. На Менскай канфэрэнцыі я паляпаў рад прыкладаў аб дрэнняй якасьці прамысловай прадукцыі. Аб гэтым напамінаў вам тут тав. Шаранговіч. Прыклад з шапкай ужо ўсім вядомы. Якасьць нашкі пікуль ня карта. Ня гледзячы на дрэнную якасьць шапка каштуе 85 руб. Чым тут віна? Зразумела рэч, ня толькі фабрыкі. Бел шпоньаб'яднаньне нясе таксама адказнасьць за якасьць сваёй прадукцыі.

Выкананьне барацьбы за якасьць зараз павінна стаць адным з важнейшых задач работы ўсёй КП(б)Б, у тым ліку і работы ЦК КП(б)Б.

Адносна якасьці прадукцыі ёсьць рад самых абгрунтаваных прыкладаў. Як напрыклад, фабрыка «Кастрычнік», якая выканала шпіцоўку за 3 гады, змагаецца за якасьць прадукцыі? У адну палову рукава кладуць вату, а другая застаецца пустой. Нітці ёсьць, а гузікаў няма. Адзін рукаў вараціі, а другі даўжэйшы. Такіх агідных фактаў больш чарнець пазыра. **Той не гаспадарнік, які не забыцца паляпшэньня якасьці ў першым-на квартале гэтага году, той дрэнны кавуніст, кто не мабілізуе масы на барацьбу за паляпшэньне якасьці прадукцыі.**

Як мы змагаемся за паляпшэньне матар'яльна-бытавых умоў рабочых? Тав. Гікало ўчора з усёй яскравасьцю, з усёй сілай падкрэсьліў гэтую задачу, як адну з важнейшых задач, ад якой залежыць пасьпяховае выкананьне прамфінплану. У паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочых дасягненьні бязумоўна ёсьць. Рэарганізацыя каапэрацыі, арганізацыя ЗРК дала магчымасьць палепшыць рабочае забесьпячэньне. Адзнак, яшчэ да гэтага часу радам цэнтральных устаноў барацьба за паляпшэньне бытавых умоў рабочых яшчэ не пастаўлена як адказьнейшая баявая задача партыі.

Вазьмецо работу сталовак, якасьць абедаў і г. д. Тут мы вельмі многа гаворым, шумім, а на справе належнага эруху не дамагліся. Сталоўка на фабрыцы «Кастрычнік», дзе працуе 2.000 чалавек, будуецца ўжо пару год. Будаўніцтва ня скончала. Ёсьць рашэньне ЦК, але «вов и ныне там». І 2.000 рабочых харчуюцца літаральна ў хлеву.

Учора з т. Гікало мы наведалі завод імя Варашылава, былі там у сталоўцы. Мы ўбачылі, што санітарнае становішча сталоўкі знаходзіцца не неналежнай вышыні. Заўвагі на гэтым пытаньні я рабіў яшчэ раней, аднак, меры ніякія ня былі ўжыты. Толькі зараз тав. Хаскін мне заявіў, што ім прыняты рад мер па прыведзеньні сталоўкі ў належны парадак. І вось наўстае пытаньне—няўжо трэба было чакаць, пакуль на завод прыедзе сакратар ЦК, сакратар гаркому, каб толькі пасьля гэтага прыняць меры па ўнармаваньні сталоўкі. Кожны дзень, кожную гадзіну трэба аддаваць увагу гэтаму важнейшаму цэху.

Трэба сказаць, што работа стаяўкі гэтага заводу пастаўлена параўнальна лепш, чым на другіх прадпрыемствах. На будаўніцтва сталовак, паляпшэньне якасьці абедаў, трэба будзе накіраваць ўсю ўвагу з тым, каб наогул паляпшыць бытавыя ўмовы рабочых, забясьпечыць выкананьне прамфінплану.

Аб камунальнай гаспадарцы. У Менску ёсьць рад дасягненьняў у рабоце камунальнай гаспадаркі. За апошнія два гады — пабудаваны трамвай, пашырана электрастанцыя, вадазабесьпячэньне і г. д. Аднак, тое становішча, у якім апынулася камунальная гаспадарка Менску, патрабуе ад ЦК партыі і ад іншых арганізацый значна большай увагі. Менск, як сталіца Беларусі, павінен стаць асабліва месца ў сэнсе ракаплена як адказьнейшая баявая задача партыі.

Вазьмецо работу сталовак, якасьць абедаў і г. д. Тут мы вельмі многа гаворым, шумім, а на справе належнага эруху не дамагліся. Сталоўка на фабрыцы «Кастрычнік», дзе працуе 2.000 чалавек, будуецца ўжо пару год. Будаўніцтва ня скончала. Ёсьць рашэньне ЦК, але «вов и ныне там». І 2.000 рабочых харчуюцца літаральна ў хлеву.

Учора з т. Гікало мы наведалі завод імя Варашылава, былі там у сталоўцы. Мы ўбачылі, што санітарнае становішча сталоўкі знаходзіцца не неналежнай вышыні. Заўвагі на гэтым пытаньні я рабіў яшчэ раней, аднак, меры ніякія ня былі ўжыты. Толькі зараз тав. Хаскін мне заявіў, што ім прыняты рад мер па прыведзеньні сталоўкі ў належны парадак. І вось наўстае пытаньне—няўжо трэба было чакаць, пакуль на завод прыедзе сакратар ЦК, сакратар гаркому, каб толькі пасьля гэтага прыняць меры па ўнармаваньні сталоўкі. Кожны дзень, кожную гадзіну трэба аддаваць увагу гэтаму важнейшаму цэху.

Трэба сказаць, што работа стаяўкі гэтага заводу пастаўлена параўнальна лепш, чым на другіх прадпрыемствах. На будаўніцтва сталовак, паляпшэньне якасьці абедаў, трэба будзе накіраваць ўсю ўвагу з тым, каб наогул паляпшыць бытавыя ўмовы рабочых, забясьпечыць выкананьне прамфінплану.

Аб камунальнай гаспадарцы. У Менску ёсьць рад дасягненьняў у рабоце камунальнай гаспадаркі. За апошнія два гады — пабудаваны трамвай, пашырана электрастанцыя, вадазабесьпячэньне і г. д. Аднак, тое становішча, у якім апынулася камунальная гаспадарка Менску, патрабуе ад ЦК партыі і ад іншых арганізацый значна большай увагі. Менск, як сталіца Беларусі, павінен стаць асабліва месца ў сэнсе ракаплення.

Прамова тав. Каменштэйна

Пэрыяд ад XIII да XIV зьезду ўвойдзе ў гісторыю партыі, як пэрыяд буйнейшых перамог усёй КП(б)Б.

Тэзісы, апублікаваныя аб другой пляцёдзе, вызначаюць далейшыя задачы, задачы пабудовы сацыялістычнага грамадзтва.

Трацкісцкая тэорыя жыцьцём, практыкай сацыялістычнай будоўлі поўнасьцю адкінута. Эвалюцыя трацкізму ўсім вядома. Ад апазыцыі ўнутры партыі, трацкізм ператварыўся ў перадавы атрад буржуазнай контр-рэвалюцыі.

Скрытыя трацкісты, кантрабандным шляхам, праз літаратуру скажаюць гісторыю бальшавізму, гісторыю УсеКП(б) Гісторыя пабудовы сацыялізму ў СССР цалкам за ленінізм, супроць трацкізму. Таму менская арганізацыя, зусім правільна зрабіла, калі выкрыла і выключыла з радоў партыі трацкіста Югава.

Пільнасьць на ідэалёгічным фронце павінна быць максымальна ўзмоцнена ра ўсёй нашай партыі. Трэба памятаць словы тав. Сталіна, на XVI зьезьдзе УсеКП(б), дзе гаворачы аб тым, што мы разьбілі трацкістаў, як контр-рэвалюцыйную групу, ён дадаўнае. «Але рашткі трацкісцкай тэорыі, перажыткі тэорыі на зусім вывестраны з нашай партыі».

Толькі пад сьцягам ленінізму, у жорсткай барацьбе з апартунізмам розных колераў, КП(б)В прышла да свайго XIV зьезду адзінай, маналітнай, згуртаванай.

Падлічыўшы практычны вопыт мінулага году, замацаваўшы становучую частку, трэба памагчы ўсе сілы партыі на выцягненьне тых недахопаў, якія ёсьць на сённяшні дзень. Гэтага патрабуе вырашэньне гістарычных гігантскіх задач сацыялістычнага будаўніцтва ў 1932 годзе.

Заключны год пяцігодкі павінен быць годам барацьбы за выкананьне народна-гаспадарчага пляну, з упорам на якасныя паказальнікі: выкананьне прамфінпляну, зьніжэньне сабекошту, якасьць самой прадукцыі, на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, перабудову работы каапэрацыі і г. д.

Прычынай недавыкананьня прамфінпляну ў 1931 годзе зьяўляецца ў першую чаргу няпоўнае ажыцьцяўленьне **6 умоў тав. Сталіна.** Мы не навучыліся яшчэ на-новаму працаваць, па-новаму кіраваць. У гэтым стрыжань усіх недахопаў мінулага году.

Прафсаюзы — школа камунізму. Прафсаюзы павінны

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

Спрэчкі па справаздачы Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Прамова тав. Хлеўнікава

Партыйныя канферэнцыі, якія праходзілі напярэдадні XIV з'езду КП(б)Б, паказалі большасную згуртаванасьць усёй КП(б)Б вакол генэральнай лініі партыі і ленінскага ЦК УсеКП(б). Толькі на аснове гэтай бальшавіцкай згуртаванасьці, мабілізаванасьці на барацьбу з трудасьцямі сацыялістычнага росту, на барацьбу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі, — КП(б)Б да XIV з'езду прыйшла з радам рашаючых посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, на фронце ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Чэрвяты, заключны год пяцігодкі ставіць перад нашай партыяй, перад усёй рабочай клясай вялізарныя задачы ў галіне сацыялістычнай рэконструкцыі гельскага гаспадаркі, разьвіцьця прамысловасьці, транспарту, разьвіцьця нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце культуры.

Гомель ва ўмовах Беларусі зьяўляецца адным з буйнейшых прамысловых цэнтраў. Прамысловасьць Гомелю асабліва бурна разьвівалася ў апошнія гады. Новая ў рэканструкцыі, з пашырэньнем старых прадпрыемстваў, у Гомелі пабудаваны і будуюцца новыя гіганты, якія маюць ня толькі беларускае, але і ўсесаюзнае значэньне, як Гомельскі, дрэвапрацоўчы камбінат, Шклабуд, элеватар, мартаравы завод і г. д.

У сувязі з ростам прамысловасьці, значна павялічылася колькасьць рабочай клясы. Калі ў 1926 г. у прамысловасьці Гомелю было занята 10.000 рабочых, дык у 1931 г. колькасьць рабочых павялічылася да 19,5 тыс. чалавек.

Я хачу спыніцца на пытаньнях барацьбы за будаўніцтва новых заводаў, на ўмовах, у якіх мы працавалі, пераматаючы згрузкаці і пераходы на нашым шляху.

Трэба адзначыць, што некаторыя заводы будаваліся вельмі марудна, не такімі тэмпамі, якіх вымагаюць інтэрэсы сацыялістычнага будаўніцтва, запатрабаваньні сельскай гаспадаркі. Мы завод Гомсельмаш пачалі будаваць у 1928 годзе. У будаўніцтва патрэбна было ўкласьці 11,5 млн. руб. Да гэтага часу ў будаўніцтва ўкладзена 7 млн. руб. У Шклабуд неабходна было ўкласьці 13 млн. руб. З гэтай сумы мы здолелі пакуль-що асвоіць толькі 7 млн. руб.

Таксама мы не асвоілі значных сум на дрэвапрацоўчым камбінаце.

Я згадваю гэта пытаньне таму, што падчас жыцьця шэрагу такіх павольных тэмпаў у будаўніцтве важнейшых прадпрыемстваў. Трэба пастаўіць пытаньне так, каб такія прадпрыемствы, як Гомсельмаш, дрэвапрацоўчы камбінат, Шклабуд, мартаравы завод, былі пушчаны на поўны ход на працягу 1932 году.

Сума капітальных укладаньняў, якая маруднуе на гэты год, на мой думку не забясьпечыць гэтага спачасовага пуску. Нам вядома, што на Гомсельмаш маруднуць адпусьціць толькі 1 млн. руб. Я лічу, што трэба з усёй сур'ёзнасьцю паставіць пытаньне аб тым, каб нашы плянуючыя органы (ВСНГ, Даяржплан) рашуча абіраліся перад саюзнымі органамі канчатковага пуску гомельскіх заводаў і абсталяваньня іх на працягу гэтага году. Для гэтага патрэбны адналовныя капітальныя ўкладаньні.

У нас ёсьць рад недарэчнасьцяй і ненармальнасьцяй, якія вядуць да замарожваньня капіталаў, да лішняй траты валюты. Вельмі часта выпісваюць з-за мяжы тыя ці іншыя машыны, якія на новых набудовах ляжаць на пекалькі месяцаў, бо да гэтых машын ня выпісваюцца адпаведныя дэталі. Гэта вядзе да нерацыянальнага выкарыстаньня залатой валюты.

У пытаньнях замежнага абсталяваньня патрэбна з усёй рашучасьцю пакласьці адпаведную плянавасьць.

У справе фінансаваньня новага прамысловага будаўніцтва цельна дацэнь пінкай ураўнілаўкі. З усяго будаўніцтва трэба ў першую чаргу вылучаць ударную групу, якая бесьперабойна павінна фінансавацца. Гэта абапіраецца, што трэба паставіць перад плянавымі плянуючымі органамі.

Мы ў хуткім часе павінны будзем пачаць набудову—калі гэта будзе канчаткова зацьверджана адпаведнымі органамі—заводу сярэдняга машынага будаўніцтва і раду прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці.

Тыя 5½ тыс. кіл. электрастанцыі, якія дае наша электрастанцыя, яно ні ў якім разе здаволіць ня могуць. Таму з усёй пастрасьцю ставіцца пытаньне аб будаўніцтве магутнай электрычнай станцыі ў 75 тыс. квт. Нам гэту стадыю патрэбна будаваць фарсаванымі, бальшавіцкімі тэмпамі. Кожнаму зразумела, што зусім не рэнтабэльна, ня выгодна і стратна для прамысловасьці будаваць дробныя карэкцыя электрастанцыі на прадпрыемстве.

Пытаньне будаўніцтва магутнай электрастанцыі тыпу БелДРЭС мы ставім з усёй вострасьцю. Неабходна, каб гэтым пытаньнем больш канкрэтна заняліся плянуючыя органы, як нашай рэспублікі, так і Саюзу.

У БССР вызначана вялікая праграма будаўніцтва новых прадпрыемстваў, рэканструкцыі старых, вялікая праграма па жыльёвым будаўніцтве і г. д. Усё гэта патрабуе ад цагельнай прамысловасьці значна больш высокіх тэмпаў работы.

Цагельная прамысловасьць у нас мае вялікі прарыў. Праграма вырабу цэглы ў 1931 годзе выканана, на 40 проц. З усёй сур'ёзнасьцю ставіцца пытаньне аб пераводзе цагельнай прамысловасьці на круглагадавую работу. Адначасова з усёй рашучасьцю ставіцца пытаньне аб механізацыі цагельнай прамысловасьці. Далей нельга дапускаць самацёкаўніцтва ў цагельнай прамысловасьці, якое ў нас зараз мае досыць шырокія размеры.

Перад намі стаяць надзвычай вялікія задачы на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва.

Толькі пры ўмове, калі мы будзем штодзенна правяраць на практычнай рабоце людзей, практычных выканаўцаў, калі мы зоймемся праверкай выкананьня по па словах, а на справе,—толькі пры гэтых умовах мы зможем выканаць гэтыя надзвычай вялікія і адказныя задачы.

Прамова т. Падшываліна

Таварышы, подзвыкананьне вытворчай праграмы нашай прамысловасьцю за мінулы год у значнай меры тлумачыцца незыстарчальнай пастановкай работы нашага транспарту. Асабліва ў канцы 1930 і пачатку 1931 г. былі трывожныя сыгналы адставаньня нашага транспарту ад бурных тэмпаў разьвіцьця народнай гаспадаркі.

Н... партыя ўзьняла гэта становішча і ўжыла рад кардынальнейшых мерапрыемстваў, накіраваных на рэканструкцыю транспарту, на ўзьнімцьце яго работы на вышыню задач сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва. У разуліце частковага ўжо ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб транспарце, дасягнуты значныя зрухі ў яго рабоце.

Калі ўзяць зварот грузаў на заходнім чыгунцы, то ў першым квартале ён быў роўны 1.257 млн. тона-кілёмэтраў, а ў чацьвертым квартале мінулага году грузазварот даведзен да 2.110 млн. тона-кілёмэтраў.

У беларускіх раёнах таксама мы маем значнае нарастаньне грузазвароту. На Гомельскім раёне ў першым квартале ўвесь грузазварот складаў 143 млн. тона-кілёмэтраў, а ў чацьвертым —2.010 млн. На Жлобінскім раёне—133 млн. тона-кілёмэтраў у першым квартале і 236 млн. тона-кілёмэтраў—у чацьвертым. Рост грузазвароту сьведчыць аб рэсьце таварнасьці гаспадаркі БССР, што выразна ахарактарызаваў у сваім дакладзе тав. Шаранговіч.

Вельмі вымярэльнікі сярэдня-сутачнага прабегу таварнага паравоза. У першым квартале мы мелі 245 клм. пры заданьні ў 217, у чацьвертым— 246 клм. супроць 235. Таксама значна ўзьнялася прабег таварнага паравоза. Яго прабег у першым квартале складаў 157 клм., а ў чацьвертым—164,5 клм. Трэба адзначыць, што прабег таварнага паравоза, які выконае надзвычай вялікую работу, яшчэ не дасягнуў устаноўленых норм. Кімэрцыйная хуткасьць таварнага паравоза ў першым квартале азначалася ў 12,5 клм., у чацьвертым квартале—16 клм. Рух цягнікоў у параўнаньні з пачаткам мінулага году значна павысіўся. Перавыдатак аналу за першы квартал складаў 10 проц. да агульнага выдатку, а ў чацьвертым квартале — 2 проц.

З прыведзеных паказальнікаў мы бачым тыя зрухі, якіх дасягнуў у сваёй рабоце наш транспарт. Аднак, было-б неправільным сьцьвярджаць, што мы маем ужо рашучы пераломм у гэтай рабоце.

Я павінен адзначыць некаторыя адмоўныя моманты, якія іншы раз дапускаюць нашы таварышы ў спаборніцтве паміж сабой. Выступаўшы з прывітаньнем ад гомельскіх чыгуначнікаў таварыш гаварыў, што яны дасягнулі 45 проц. эканоміі на змазцы. На змазцы можна з'эканоміць і больш, але да гэтай справы трэба падыходзіць надзвычай асьцярожна. Трэба эканоміць там, дзе трэба і можна эканоміць, але эканомія на змазцы, асабліва на змазцы адказьнейшых дэталяй паравоза, можа даваць нам страты.

Пакалькі слоў аб стане нашай паравознай гаспадаркі. Колькасьць хворых паравозаў з 1-га да IV-га кварталу мінулага году зьменшылася з 27 да 18 проц. Гэты процант яшчэ надзвычай вялікі. У справе рамонту паравозаў мы залежым ад заводаў, якія не заўсёды выконваюць у тэрмін нашы заказы.

Калі мы змагаемся за павышэньне работы транспарту, за павышэньне яго колькасных і якасных паказальнікаў і дасягаем частковага павышэньня гэтых паказальнікаў, то гэтымі дасягненьнямі сёньняшта дня ні ў якім разе нельга задавальніцца. Мы не павінны выпускаць з пункту погляду нашых перспэктыў, далейшых вялізарнейшых задач. У гэтым годзе мы абавязаны павысіць грузазварот на 33 проц. Гэта задача патрабуе надзвычай напружанай работы.

Наш вагонны парк знаходзіцца яшчэ не ў задавальняючым становішчы. У трэцім квартале мінулага году мы мелі вялікую колькасьць хворых вагонаў, якія складалі 9 проц. Зараз дасягнута зьніжэньне колькасьці хворых паравозаў на 6 проц. пры заданьні—2 проц. Вялікая колькасьць хворых паравозаў у значнай меры тлумачыцца тым, што да вагоннага парку прад'яўлены надзвычай вялікія, больш жорсткія патрабаваньні. Мы арганізавалі двухбаковы абмен вагонаў, але яшчэ да гэтага часу не забясьпечылі належнай якасьці рамонту. Для таго, каб прывесьці вагонны парк у належнае становішча, патрэбны вялікія матар'яльныя фонды, фонды запасных частак. Трэба разьлічваць ня толькі на атрыманьне гэтых фондаў цэнтралізаваным парадкам, а і максымальную ўвагу аддаць справе рэалізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Недахопы ў рабоце нашага транспарту, даволі частыя выпадкі здарэньняў тлумачацца яшчэ адсутнасьцю належнай працоўнай дысцыпліны. Узмацненьне працоўнай дысцыпліны — адна з важнейшых задач нашай работы ў сыстэме ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб транспарце.

Я гаварыў аб павышэньні норм грузазвароту на 1932 год. Наша задача—па-бязвоме падрыхтаваць чыгунку да асваеньня гэтага вялікага грузапатоку. Неадкладна трэба заняцца прывядзеньнем у лепшы парадак нашай паравозной і вагоннай гаспадаркі.

У пісьмовай справаздачы ЦК КП(б)Б адзначана, што транспарт да гэтага часу застаецца вузкім месцам у сыстэме народнай гаспадаркі. Гэта зусім правільна. Пад кіраўніцтвам партыі наш транспарт выйдзе на шырокую дарогу разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва. Наш партыйны з'езд падвядзе больш шчыльна ўсе зьвенні партыйнай арганізацыі да задач вышэйшага работы транспарту, якія пастаўлены перад ім у чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі.

Прамова т. Канавалава

Дасягненьні, якія набыты за пэрыяд ад XIII з'езду ў рабоце партыйнай арганізацыі, зьяўляюцца вынікам упартай работы ўсёй КП(б)Б па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі, вынікам цьвёрдага і правільнага кіраўніцтва з боку ЦК.

Аб гэтых посьпехах я гаварыць ня буду, спынюся на некаторых недахопах нашай практычнай работы. Мы яшчэ мала ўвагі зварачаем на праверку выкананьня даных дырэктыў. Да прыкладу падамо такі факт. У Быхаве бутэўніца прадпрыемства з лёгку «518». ЦК намоўў пусьціць завод у сьнежні 1931 г. Дырэктыва ня выканана. Гэта тлумачыцца тым, што спаведныя гаспадарчыя арганізацыі не навучыліся па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць.

Спецыялізацыяй сельскай гаспадаркі займаюцца адпаведныя зямельна-калгасныя органы. Характэрна, што спецыялізацыя праходзіць без узьлёту мас, у гарэнтах. Ёсьць такія прыклады, калі рад саўгасаў па працягу двух год «спецыялізаваліся» на 5-6 раз.

Транспарт яшчэ застаецца вузкім месцам у сыстэме народнай гаспадаркі. Транспарт ня здолеў смяячасова справіцца з перакідкай бульбы, не дае патрэбнай колькасьці вагонаў для перакідкі дроў. У Быхаве ёсьць каля 300 вагонаў дроў, і гэтыя цовы ляжаць без руху, бо не падаюцца вагоны.

Каля 10 сыслем у нашым раёне вядуць загатоўкі: Каанскаюз, Спажыўсаюз, Белмясаюз, Шляхгародніка, Белпушніна і т. д. Як толькі падышла загатоўчая кампанія, адразу пачаліся спрэчкі аб цэнах, дзяльба тэрыторый і г. д. Трэба рэарганізаваць загатоўчы апарат, зрабіць яго больш гібкім, набліжаць да месц, вызначыць яго функцыі.

Прамова т. Шапіра

Нядаўна ў друку былі апублікаваны даныя нямецкага кан'юнктурнага інстытуту аб тым, што па аб'ёме прамысловай прадукцыі Германія стаіць на 9 месцы, а СССР заняў другое. Гэтыя даныя, што выходзяць з буржуазных крыніц, лопі за ўсё дэманструюць перавагу сацыялістычнай, савецкай сыстэмы над капіталістычнай, паказваюць посьпехі індустрыялізацыі СССР.

БССР у мінулыя пяцігодкі ператварыла сабой краіну дробна-тавараных, селяніскіх гаспадарак і распыленых самацёкавых промыслаў. Зараз, дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі, разьвівае сваю прамысловасьць. Паводле кантрольных лічбаў 1932 году БССР будзе выпускаць прамысловай прадукцыі ў 15 раз больш, чым у дакастрычніцкі час (без прамкаапэрацыі).

Па лініі сельскай гаспадаркі запраектавана ахваціць плошчу апрача калгасаў пад саўгасамі—240.000 га.

Ва ўмовах БССР асабліва важным пунктам пяцігодкі-гаспадарчага плану 1932 году зьяўляецца капітальнае будаўніцтва, якое ў бягучым годзе разьвіцца больш чым на 400 млн. руб. У нас ёсьць такія важныя аб'екты будаўніцтва, як Менская ЦЭЦ, Гомельская электрастанцыя, Крычаўскі цэмантны завод, Гомсклабуд, Магвалаканбуд і інш.

Такі размах капітальнага будаўніцтва патрабуе сканцэнтраваньня ўвагі ўсёй партыйнай арганізацыі на ходзе будаўніцтва кожнага аб'екту.

Выкананьне плянаў капітальнага будаўніцтва знаходзіцца ў цесным сувязі з забясьпечаньнем будаўнічымі матар'яламі. Распрацаваны балянс будаўнічых матар'ялаў выходзіць з таго, што, з адкага боку, будаўніцтва на вішна прыпадзіцца на ўдарных аб'ектах, а з другога боку па новых тыпах будаўніцтва, якое-б у мінімальнай ступені патрабавала дэфіцытны і прывозны матар'ял. Неабходна зьвярнуць увагу мясцовых арганізацый таксама на разгортваньне самазагатовак лесаматар'ялаў, бо іх дэфіцыт ня будзе пакрыт у цэнтралізаваным парадку.

Работа нашай прамысловасьці залежыць ад выкананьня праграмы па здабычы торфу. Паводле плянаў у гэтым годзе павінна быць здабыта 1.648 тыс. тон торфу. Гэта лічба сьвяцьцяцца асноай з асноўных у народна-гаспадарчым плане 1932 году, якую павінен водаць кожны з нас і за выкананьне якой трэба па-бальшавіцку змагацца. Плянам прадугледжана таксама выпусьціць 353 млн. абпаленай цэглы. Выкананьне гэтай праграмы, у сувязі з тым абставаньнем, якое мела месца ў гэтай галіне летась, набывае выключна важнае значэньне.

Прамова тав. Судакова

Трэці рашаючы год пяцігодкі быў годам бальшавіцкіх тэмпаў, годам разгортваньня новага будаўніцтва, увядзеньня ў строй раду буйнейшых гігантаў сацыялістычнай індустрыі.

За гэты год вырасла партыя, рабочая клса і яе актыўнасьць, на дзесяткі тысяч чалавек вырасла камсамольская арганізацыя. Памножыліся перамогі на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Гэтых перамог партыя дамагалася дзякуючы пэўхільнаму ажыцьцяўленьню генэральнай лініі, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ЦК КП(б)Б, выразнаму правядзеньню ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Падагульваючы нашы перамогі, мы асабліва павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу на выяўленьні недахопаў у нашай рабоце з тым, каб гэтыя недахопы ў барацьбе за пасьпяховае выкананьне плянаў завяршэньня году пяцігодкі лік відавацьць і ўступіць у новую пяцігодку з яшчэ большымі перамогамі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Я ў сваіх выступленьні хачу спыніцца на пытаньні работы Віцебскай прамысловасьці, на пытаньні энэргетыкі і на рабоце БелДРЭС.

Віцебск за апошнія гады надзвычай вырас, стаў адным з буйных прамысловых цэнтраў Беларусі.

Але як мы забясьпечылі работу нашай прамысловасьці, як мы скарыстоўваем вытворчыя магчымасьці новых буйнейшых прадпрыемстваў, трэба сказаць, што нам у гэтым напрамку далёка ня ўсё зроблена.

Апошнія 3½ месяцы работы Віцебскай прамысловасьці, паказалі, што рад нашых гаспадарчых арганізацый і цэнтральных устаноў ня справіліся з выкананьнем задач, якія паставіла партыя. У прыватнасьці тарфяныя аб'яднаньні сарвалі пляны будаўніцтва, апачна перашкодзілі барацьбе за выкананьне прадпрыемстваў.

Адначасова з гэтым, шасобныя партыйныя арганізацыі і дагэтуль яшчэ не зразумелі значэньні і ролі БелДРЭС. Факт застаецца фактам, што БелДРЭС працуе са значнымі перабоямі, а гэта ў сваю чаргу адбываецца на рабоце прамысловасьці.

Віцебская прамысловасьць панесла мільёны руб. страт. Задача ліквідацыі перабояў у рабоце БелДРЭС перарасла ў палітычную справу ня толькі для Віцебску, Магілеву, Ворпы, але і для ўсяе БССР.

Мы ў Беларусі, маючы вялікую тарфяную базу, набудаваўшы БелДРЭС—павінны былі згуртаваць вакол гэтай электрычнай станцыі ўвагу ўсёй пралетарскай грамадзянскай БССР. Газета зроблена ня было, у сувязі з чым ЦК КП(б)В змушаны быў умяшацца ў работу БелДРЭС.

Што мы зараз маем на БелДРЭС?

Безгаспадарчасьць, непыкананьне праграмы па здабычы торфу, анархічнасьць стаўку на самацёк. На БелДРЭС да гэтага часу нічога ня зроблена па рэалізацыі в умоў тав. Сталіна.

Задача ўсёй партыйнай арганізацыі зараз заключаецца ў тым, каб бальшавіцкімі тэмпамі, пры ўдзеле ўсіх без выключэньня раёнаў, дапамагчы БелДРЭС. А гэтай дапамогі ў значнай меры залежыць посьпех работы Віцебскай, Магілеўскай і Аршанскай прамысловасьці. Мне здаецца, што Цэнтральны Камітэт нашай партыі павінен больш рашуча паставіць пытаньне аб рабоце БелДРЭС, узмацніць яго шчэраванымі і моцнымі работнікамі, узяць пад партыйныя арганізацыі, якія пакуль не пераўдзелі ў сэнсе выкананьня дапамогі БелДРЭС.

Другое пытаньне,—гэта аб распрацоўцы плянаў другой пяцігодкі.

У нас ёсьць база, на якой можна разгортваць шырока электрыфікацыю.—Гэтай базай зьяўляецца торф. Побач з торфам, мы маем рад такіх багацьцяў, якія яшчэ ня толькі не скарыстоўваюцца, але якія на сталі прадметам нашага пыркага абгаварэньня. Возьмем для прыкладу такое багацьце як вопыя прагоры БССР, як мнагаводныя рэкі.

Чаму, падыходзячы да распрацоўкі праблем другой пяцігодкі, мы павінны пастаўіць пытаньне аб набудове гідраэлектрастанцыі на раце Дзьвіне?

Трэба ўлічыць, што водная энэргія зьяўляецца базай такіх электрастанцый. Дзьвіна, якая зараз яе на ўсім мала карысьці, можна быць ператворана у самую суднаходную раку.

Цяпер, калі мы практычна падышлі да пытаньня будаўніцтва электрастанцыі у Менску, Гомелі,—нам неабходна паставіць пытаньне аб стварэньні агульнага энэргетычнага балянсу для ўсёй БССР. Без стварэньня такога спаргалкальца, пры найменшай аварыйнасьці, прымачыць пад увагу распыленасьць нашых электрастанцый, мы будзем мець перабоі ў рабоце нашай прамысловасьці. Таму гэта пытаньне трэба ўжо зараз пачаць канкрэтна распрацоўваць.

С месяцаў таму назад ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб рабоце і становішчы ў Віцебскай партыйнай арганізацыі. ЦК у той час а зазначыў, што Віцебская партарганізацыя мае рад буйнейшых прарываў на выкананьні прамфінплану, на ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, па разгортваньні бальшавіцкай самакрытыкі.

Як-жа партарганізацыя здолела ажыцьцявіць бальшавіцкія ўказаньні ЦК нашай партыі?

Другая Віцебская гарадзкая партканфэрэнцыя, якая нядаўна закончыла сваю работу, дэтальна абгаварыўшы работу гаркому партыі, прыйшла да высноўку, што мы маем толькі некаторыя зрухі ў ліквідацыі прарываў, што мы яшчэ цалкам ня спраўіліся з выкананьнем тых задач, якія былі ўскладзены на арганізацыю ЦК нашай партыі.

Трэба падкрэсьліць, што галоўная і асноўная прычына нашай дрэнней работы заключаецца, тым, што мы да гэтага часу яшчэ не пераадолелі ўвесь ніжэйшы партыйнай работы у нізавое звяно—у цэх, брыгаду, зьмену, ячэйку. Бяда ў тым, што мы б умоў тав. Сталіна яшчэ канкрэтна не рэалізавалі.

У Віцебску мы маем надзвычай бурны рост рабочай клясы, рост прадпрыемстваў на шэйнай і трыкатажная прамысловасьці. ЦК улічваны разных прамысловага будаўніцтва і рост рабочай клясы, у свой час абазначаў ня толькі Віцебскую арганізацыю, але і рад цэнтральных устаноў, зьвярнуць больш увагі на камунальную гаспадарку, на матар'яльна-бытавое абслугоўваньне рабочых.

Між тым, трэба падкрэсьліць, што ў гэтым напрамку мы яшчэ ніякіх зрухаў ня маем. Таму перад партыйнай арганізацыяй Віцебску стаіць надзвычай адказныя і вялікія задачы па паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоваў рабочых, па разьвіцьці камунальнай гаспадаркі.

Прамова т. Яўсеенка

Пытаньне плянаваньня ва ўмовах разгорнутага будаўніцтва сацыялізму набывае асабліва актуальнае значэньне.

Аднак, нашы некаторыя цэнтральныя ўстановы, замест плянаваньня іншы раз проста блытаюць справу. Вось дзе-небудзь, прыкладам у плане жэсткавой пасеўнай кампаніі спусцае ў раён (Рагачоўскі) адну кантрольную лічбу, а пасоўным яго аб'яднаньні зусім іншую. Насеньгаводгатора паперакор дырэктыве Наркамзему адносна засеву сеўсенных культурамі з 3 пал. тыс. га, аказаць зноў і той жа поштаю прысылае заданьне на засеў 7 тыс. га. Выбірай, каму тут падпарадкавацца.

Зараз разгортваецца падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі, правядзіцца рамонт с.-г. машын, трактараў і інш. З цэнтру прысылалі плян рамонту гэтых машын. Паводле гэтага плану Цэнтрэнфіт сартас павінен адгрэбваць свае трактары для рамонту ў Гомель, а Гомель назадарот, прысылаць свае трактары для рамонту ў Рагачоў. Далей, Жлобінскі раён дазнае дабро ліквідаваць, але і по сёньняшта дня ўзяго адрас пасіроўваецца с.-г. машыны. Яны валяюцца на станцыі месцамі. Больш таго, падаўна прыбыла складская машына (конная сеялка) у адрас банку. Адкуль ат адмаўляецца прыняць яе, ня ведаючы па якой прычыне прысланая машына, і гэтая сеялка стаіць больш трох месяцаў.

А гэта гаворыць аб тым, што пытаньні плянаваньня, правяраньня выгоду нашы некаторыя ўстановы ня цікавяцца. Пасьля гэтага нельга казаць аб іх арэрадыцыйнасьці ў кіраўніцтве раёнамі.

Тут некаторыя выступаючыя таварышы скардзіліся на тое, што ў іх завы на завозкі мінеральных удабрэньняў. А я павінен адзначыць, што ў Рагачоўскі раён завезена ўнасыпка на тры гады наперад, шмат якога ўжо сэкэканалася і заінула.

Наконт сустрэчных перавозак прыведу такі маленькі факт. Наш раён атрымлівае цэмэнт з Быхава, а ў Рагачоўе свая цагельня. Нам давяць нарад, каб мы са сваёй цагельні адгружалі цэмэнт у Ворпу. Такія сустрэчныя перавозкі, акрача вялікіх матар'яльных страт нічога даць ня могуць. На гэта дальнабойнасьць трэба рэагаваць самым рашучым чынам.

Апошнае—адносна вывазкі торфу. Як вы ведаеце з дакладу тав. Шаранговіча і матар'ялаў друку, нашы прамысловасьць мае сяньня страчы ад несвоечасовага завозу торфу для БелДРЭС. У той-жа час торфабазьнаньне на апошнята засу моўчкі абыходзіць гэта пытаньне.

Гэта ўсё патрабуе рашучай перабудовы работы сакрэтых і гаспадарчых устаноў.

Прамова тав. Разумава

Мы маем вялізарныя дасягненьні ў галіне прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. За пэрыяд ад XIII з'езду прамысловасьць Віцебшчыны значна вырасла. Уступіла ў строй 5 буйнейшых прадпрыемстваў з колькасьцю рабочых звыш 23.000.

У адпаведнасьці з ростам нашай прамысловасьці, з уздымам творчай актыўнасьці рабочай клясы неабходна паляпшыць матар'яльна-бытавое абслугоўваньне рабочых мас. Я якраз і хачу спыніцца на гэтым пытаньні, на пытаньні, як выконвае дырэктывы партыі наша каапэрацыя ў справе рабочага снабжэньня.

У Віцебску працавала спэцыяльная камісія, якая выкрыла рад фактаў яўных скажэньняў. На працягу другога паўгодзьдзя 1931 г. пераважнае снабжэньне ўдарнікаў было сарвана. Белкаанскаюз не адпусьціў ніякіх тавараў для гэтай мэты.

ЗРК, арганізаваныя за апошні час, мелі нінкага кіраўніцтва сваёй работай і дапамогі з боку Белкаанскаюзу. Нават ЗРК такога важнага прадпрыемства, як завод «Чырвоны жэлаўёт», амаль нічога не атрымаў ад Белкаанскаюзу.

Зразумела, што ў нас ёсьць труднасьці ў справе рабочага снабжэньня. Але пры правільнай пастаноўцы работы, пры правільным плянаваньні з боку Наркамснабу і Белкаанскаюзу, без ўмоўна мы можам мець значна лепшае снабжэньне.

Дрэнная справа ў нас, у Віцебску, і з будаўніцтвам. Напрыклад, распачатае 2 гады назад будаўніцтва такога буйнейшага прадпрыемства, як «Сьпіг індустрыялізацыі», яшчэ да гэтага часу ня скончана. Прычыны: адсутнасьць некаторых пазначых рэчаў, якія ўжо ня так цяжка здабыць при ўмовах, калі ў рабоце цэнтральных органаў снабжэньня дэфіцытныя матар'ялы былі-б больш гібкасьці і больш уважлівасьці.

Нашым гаспадарчым арганізацыям неабходна па-сапраўднаму перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі, па-сапраўднаму папярэдуцца тварам да вытворчасьці. При гэтых умовах мы дасягнем значна большай эфэктыўнасьці ў справе выкананьня вытворчых праграм.

Прамова тав. Кудзелькі

Усе раённыя і гарадзкія партканфэрэнцыі далі ацэнку палітычнай лініі ЦК ГП(б)Б, прызнаўшы яе цалкам правільнай.

Мясцовыя партарганізацыі ня могуць паскардзіцца на невыстарчальнасьць кіраўніцтва ЦК іх работай. ЦК партыі перабудаваў сваю работу ў напрамку канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва па важнейшых палітычна-гаспадарчых пытаньнях і, дзякуючы гэтаму, па аснове пяўхільнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, КП(б)Б дабілася посьпехаў у сацыялістычным будаўніцтве.

Я хачу спыніцца на некаторых пытаньнях, якія без умяшаньня ЦК партыі ня могуць быць вырашаны непасрэдна ў раёнах. Перш-не, гэта пытаньне прыгарадных гаспадарак. Усе вы добра ведаеце, як ставіў пытаньне ЦК партыі аб разьвіцьці і пашырэньні прыгарадных гаспадарак. ЦК патрабаваў да іх з боку ўсіх арганізацый вялікай увагі.

Што-ж мы маем?

Прыгарадныя гаспадаркі ў нізкім становішчы. Пасьляховае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі, пашырэньне плошчы гародных культур—пад пагрозай. Некаторыя прыгарадныя гаспадаркі ня маюць сёньня зваротных сродкаў і рэсурсаў, каб выканаць з посьпехам задачы веснавой пасеўнай кампаніі.

Другое, укладаньні ў прыгарадныя гаспадаркі на лініі ЦРК. Прыгарадныя гаспадаркі пастаўлены ў дрэнне фінансавае становішча. Некаторыя ЦРК, напрыклад, Мазырскі, уклаў у прыгарадныя гаспадаркі каля 570 тыс. руб. як уласных сродкаў, так і па лініі банкаўскага крэдыту. Цяпер пры правядзеньні жорсткай фінансавай дысцыпліны банк паступова адлічвае ад ЦРК свае грошы, і ЦРК стаіць пад пагрозай немагчымасьці разгортваць сваю дзейнасьць.

Цяпер, калі прыгарадныя гаспадаркі перададзены непасрэдна Белкаанскаюзу, то зразумела, што Белкаанскаюз і вінен вярнуць тыя грошы, якія ЦРК уклаў, але Белкаанскаюз ня толькі ня стаіць так пытаньне, наадварот. Напрыклад, у нас прадпрыемства Белкаанскаюзу замест таго, каб стаяць пытаньне аб звароце грошай ЦРК за прыгарадныя гаспадаркі, гаспадаў пытаньне аб неабходнасьці ліквідаваць ЦРК і арганізаваць замест яго іншыя казэнныя арганізацыі — гарспажыўтаварыства.

Такая пастаноўка пытаньня ня вытрымлівае ніякай крытыкі. Яна вельмі нагадвае рапейшага прыватніка.

Трэцяе пытаньне — аб веснавой пасеўнай кампаніі. Наш раён мае жыльёзагадоўчы кіручак. І прадзільна Наркамзем праектуе значна павялічыць пасеўную плошчу траў і коранеплодаў. Але мы стаім перад пытаньнем, што тая плошча, якая запраектавана Наркамземам, ня зможа быць засеяна без завозу насеньных траў—канюшыны, гарадзі і вікі. У мінулым годзе, з прычыны таго, што ў нас ня было насеньня, мы ня выканалі плану веснавой сяўбы. Так што без завозу насеньня мы ня зможам і зараз выканаць плянаў пасеўнай плошчы, якую вызначыў Наркамзем, бо загатовіць у нас, у раёне, уласнымі сіламі ў калгасным і адпасобным сэктары патрэбную колькасьць насеньня мы ня зможам.

Два словы наконт экзаменічнага вывучэньня раёнаў. Тав. Шаранговіч правільна паставіў пытаньне, што гэта справа ў нас вельмі дрэнна пастаўлена, што ў нас ёсьць цэлы ляпсусаў па лініі плянаваньня, па лініі вызначэньня адпаведных заданьняў і г. д. Правіла тав. Шаранговіч паставіў пытаньне аб тым, што раёны былі і Мазырчыны павінны запяцца пытаньнямі культываваньня балот, каб разьвіваць тэхнічныя культуры. Але гэта вымагае лепшага забясьпечэньня нас спэцыялістамі. Зараз Мазырскі раён мае толькі трох агранома, у той-жа час іншыя раёны лепш забясьпечаны тэхнічнымі сіламі.

Правільна паставлена пытаньне, што цэнтральны апарат не перабудаваў сваёй работы ў напрамку канкрэтызацыі кіраўніцтва раёнамі.

ПАСТАНОВА 14-га ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў паставлена партыяй як цэнтральная задача калгаснага будаўніцтва на даным этапе.

«... Задача арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і сацыялістычнага перавыхаваньня калгасных мас павінна стаць у цэнтры ўвагі і ў другой пяцігодцы» (з тэзісаў на XVII партканфэрэнцыі).

Адзначаючы вялікае палітычнае значэньне правядзеньня конкурсу «Праўды» і ЦК ВЛКСМ па лепшую работу на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньні калгасаў, XIV зьезд КП(б)Б пастанаўляе:

1. **Устанавіць два пераходныя сьцягі ад XIV зьезду КП(б)Б** для ўдарных у справе правядзеньня конкурсу «Праўды» і ЦК ВЛКСМ раёнскіх партыйных і радзянскіх газэт (цэнтральных, раённых, нізавых) за лепшую арганізацыю работы на ўмацаваньні калгасаў, укараненьні ў калгасна-саўгасную вытворчасьць 6-ці ўмоў тав. Сталіна, барацьбе з абязьлічкай, ураўнілаўкай, за правільнае размеркаваньне ўражаю, смяячасовую і разгорнутую падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі, поўнае выкананьне ўсіх загатовак і г. д.

2. Адзначаючы адказьнейшую ролю, якую ўскладзена на нізавы друк і раёнкораў у справе дапамогі партыйным арганізацыям у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, XIV зьезд КП(б)Б **падкрэсьлівае, што работа па ўзмацненьні сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і рабселькорамі зьяўляецца адным з адказьнейшых участкаў агульна-партыйнай работы, выходзячы з таго, што друк зьяўляецца «самай вострай, самай моцнай зброяй партыі»** (Сталін).

XVII УСЕСАЮЗНУЮ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЮ АДЗНАЧЫЦЬ РАШАЮЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ НА ФРОНЦЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Да ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і серадняко ў

(Адкрыты ліст гаспадарча-разрахунковых брыгад фабрыкі „Дзьвіна")

Самая буйная ў БССР ільна-пракільная фабрыка «Дзьвіна» працуе з перабоямі. Якасьць выпускаемай прадукцыі на зусім здавальняючая. Сярод прычын, як унутрызаводзкага парадку (невыстарчальна рэалізаваны 6 умоў тав. Сталіна, перабоі з падачай энэргіі і г.д.), пэўнае месца належыць дрэнному снабжэньню сырцом і ў прыватнасьці нізкай якасьці пастаючага ільнавалакна. Фабрыка «Дзьвіна» павінна атрымаць на прам фінпляне за загатоўчы сэзон 1931-32 году 18 проц. усяго ільну, што загатаўляецца ў БССР.

За першы квартал загатовак, г. зн. тады, калі валакно павінна паступаць на склады фабрыкі ў галоўнай сваёй масе, атрымана ўсяго (да сёньняшняга дня) 1.000 тон ільну, або менш 20 проц. Прычым паступаючы ільн яўна нездавальняючай якасьці. Замест сярэдняга № 10,8. мы атрымліваем у лепшым выпадку № 6. 7.

Слабыя тэмпы загатовак ільнавалакна па рэспубліцы (усяго на 20 студзеня 50,3 проц.), паніжаныя гэтых тэмпаў за апошнія пяцідзёўкі, слабы год паступленьня валакна на фабрыкі і зусім нізкая яго якасьць — усё гэта выклікала ў нас трывогу. Мы зьвяртаемся да вас т. т. калгасьнікі і аднаасобнікі — беднякі і серадняк з заклікам **ПАВЫСЦЬ ТЭМПЫ ЗАГАТОВАК, ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ АПРАЦОЎКІ.**

Таварышы калгасьнікі і аднаасобнікі! Мы, ударнікі ватэрнага, матальнага, істужкавага, пакавальнага і часальнага цэхаў, працуючы на фабрыцы, асабліва адчуваем, якія страты можа атрымаць дзяржава, а з ёю разам вы і рабочая класа пры найменшым недавыкананьні пляну загатовак, пры нізкай якасьці апрацоўкі ільнавалакна. Для таго, каб кожны з вас да канца ўразумеў гэта, прыводзім некалькі лічбаў.

Недастача адной тоны ільнавалакна пазбаўляе нашу рэспубліку 120 клн. мэтраў ткані, або 5.600 мэтраў лепшай тканіны. Гэта толькі адная тона. Ня пяжка ўявіць, колькі мэтраў мануфактуры вы недаталі працоўнаму спажыўцу, недавыкананьні загатовкі на 48,2 проц.

Ці ёсьць магчымасьці выкананьня пляну? Так, ёсьць усе магчымасьці. Гэта з найбольшай сілай пацьвярджаецца на вопыце перадавых калгасаў, сельсаветаў і пасобных раёнаў.

«Калгас «Камсамолец», Любаньскага раёну, па-ударнаму правёў апрацоўку і здачу ільну. Былі створаны ўдарныя брыгады, якія працавалі амаль круглыя суткі. Ільнамялкі прыводзіліся ў рух конным прыводам зд малатарні. Недалёка ад сушні быў абсталяваны стары будынак, у якім прводзілася трпаньна ільну. Лепшыя калгасьніцы-ударніцы прэміраваны» («Зьвязда», № 335).

Няўжо гэта непавучальна? Няўжо нельга кожнаму калгасу выкарыстаць вопыт падобнай «Камсамольцу» арганізацыі работы?

Зразумела, калі-б усюды была правільна арганізавана работа, калі-б у кожным калгасе ялася дзейная барацьба з ураўнілаўкай, з кулацкім дзеляжом, мы ня мелі-б такіх фактаў, як напрыклад у Лепельшчыне, дзе:

«тэмпы апрацоўкі і здачы ільнавалакна за апошнія пяцідзёўкі значна зьнізіліся. На 11 студзеня загатоўлена 48,1 проц. гадавога пляну. Асабліва дрэнна ідзе паступленьне па кантрактацыі ад аднаасобнага сэктару» («Зьвязда», ад 19-га студзеня).

Важнейшым і, бадай, рашаючым зьвяном барацьбы за выкананьне ільназагатоўчага пляну павінна быць якасьць. Нізкасортнасьць паступаючага на фабрыку «Дзьвіна» ільнавалакна значна пагоршыла тэхніка-эканамічныя паказальнікі. Загрубеньне ільноў у першую чаргу выклікала перавыдатак валакна, павышэньне пропанту ўгару да 3 і значнае павялічэньне колькасьці рабочых на апэшку абсталаваньня. Павышэньне пропанту ўгару дало ўжо фабрыцы за 1 год 33.600 руб. страт.

«Дрэннае валакно паступае ня толькі з аднаасобнага сэктару, але і ад калгасаў. Прычым у пасобных раёнах мы маем высокі процант паклі. Калгас «Новы сьвет», Сіроцінскага раёну, здаў з адной восеці 2-3 пуды валакна і 3-4 пуды паклі. На Шумілінскую базу паступае пён у сярэднім 5 і 6 нумароў» («Зьвязда», № 333).

Ці можна ўнікнуць падобных фактаў, г. зн. уніякнуць вялікіх страт і перавыдаткаў валакна на апэшку тканіны? Бязумоўна, можна.

Справа зноў такі ў правільнай арганізацыі работы па пераапрацоўцы, у штодзённым кантролі, у беражлівых сацыялістычных адносінах да каштоўнейшага матар'ялу, у няўхільным жаданьні тэрмінова і поўнасьцю выканаць свае абавязкі перад дзяржавай.

Супроць сваячэньства і поўнага выкананьня пляну, супроць здачы добраякаснага валакна выступае і змагаецца клясавы вораг — кулак і яго апартуністычная агентура.

Сваю падрыўную работу кулак праводзіць шляхам сабатажу цьвёрдых заданьняў. Кулак імкнецца пашырыць атрутную дзейнасьць ня толькі ў межах аднаасобнага сэктару. Ён прабуе выкарыстаць усякую шчыліну, каб пралезьці ў калгас і падарваць яго гаспадарчую магутнасьць. У адносінах ільназагатовак кулацкая работа знаходзіць сваё выяўленьне ў распальванні дробна - ўласьніцкіх, спажывецкіх тэндэнцый, у імкненьнях па ўраўнілаўскім прынцыпе разьдзеліць валакно паміж калгасьнікамі.

«Калгас «Чырвоны бацэ» № 2 (Бабруйскага раёну), павінен здаць больш тоны ільнавалакна, на сёньнешні дзень ня здана ніводнага кілё. Увесь лён разьмяркован сярод калгасьнікаў. Анарэгічнае становішча ў калгасах «Камінтэрн» № 1, «Новае жыцьцё» і «Савет». Частка калгасьнікаў арцелі «Пяцігодка», Ляшчанскага сельсавету, атрымаўшы вялікую колькасьць ільнавалакна, прадалі яго напрыватны рынак. («Зьвязда» 15 студзеня).

Тут, бясспрэчна, «прыладзіў» сваю ручку кулак. Тут відавочна дапаможніцкая роля яго праваапартуністычнай агентуры.

Таварышы калгасьнікі і аднаасобнікі — беднякі і серадняк! Мы значна падвыкапалі ільназагатоўчыя пляны, не заваявалі яшчэ права рапартаваць аб перамогах на гэтым вучастку. **Мы абавязаны яго ЗАВАЯВАЦЬ.**

У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАНЬНЕ ПА ІЛЬНАЗАГАТОЎКАХ — таксама баявая задача дня.

Мы маем **УСЕ МАГЧЫМАСЬЦІ** для таго, каб за час работы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі дабіцца рашаючай перамогі на ільназагатоўках.

Мы гэтага даб'емся толькі тады, калі мацней будзем націскаць на кулака, жорстка біць па апартуністах, калі кожны ільнаапрацоўчы пункт, кожная ёўня будуць пераведзены на круглясутачную работу.

НАШ ЛЁЗУНГ — ні адзін гадзіны прастою, ні аднаго працаздольнага члена калгасу па-за ўдзелам у практычнай рабоце па апрацоўцы ільнавалакна. Усе працэсы апрацоўкі на прэміяльна-прагрэсыўную зьдзельшчыну.

Барацьба за лён ёсьць разам з тым барацьба за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за выкананьне агульных пляноў гаспадарчага будаўніцтва, барацьба за паўхільнае палепшэньне матар'яльна-бытавога становішча рабочай клясы і працоўных мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і серадняко ў.

Мы заклікаем перадавых калгасы і сельсаветы арганізаваць грамадзкі бухгалтэрскі кантроль, у дапамогу адсталым сельсаветам, калгасам і аднаасобнікам!

Па прыкладзе нашых ударных брыгад разгортваўшае сацыялістычнае спаборніцтва на лепшую апрацоўку і хутчэйшую здачу ільнавалакна дзяржаве. **Дабівайцеся ў найкарацейшы тэрмін завяршэньня пляну гэтага важнейшага віду загатовак!**

Па даручэньні гаспадарча-разрахунковых брыгад:

Стара-істужкавага цэху — **Лебедзева, Гузава.**

Нова-істужкавага цэху — **Гусарава, Пасрэднікава.**

Матальнага цэху — **Буцянава Дуброўская.**

Ватэрнага цэху — **Драгунова.**

Пакоўка-сушыльнага — **Кухта.**

Чоска — **Бяльковіч.**

Чырвоны абоз у падарунак партзьезду

ГОРКІ. (Па тэлеграфу).

23 студзеня, у дзень адкрыцьця XIV зьезду КП(б)Б, калгасы Горацкага раёну арганізавалі чырвоны абоз, якімі здана на загатоўчыя пункты 115 цэнтн. ільнавалакна.

Мабілізован увесь раённы актыў для арганізацыі масавых абозаў з ільном у падарунак XIV зьезду партыі.

Нам. старшыні РВК ВАРОЎСКІ.

Старшыня райкаапсаюзу КОНЮХАЎ.

Год перабудовы транспарту

Прайшоў год з часу апублікаваньня здовы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб рабоце чыгуначнага транспарту, у якой былі намечаны канкрэтныя шляхі барацьбы за «рашучае падцягваньне транспарту да ўзроўню тых запатрабаваньняў, якія ставіць перад ім бурны рост асноўных галін народнай гаспадаркі».

Галоўнае зьвяно чыгуначнага транспарту — паравозны парк — у момант здовы ЦК і СНК знаходзіўся ў надзвычай цяжкім становішчы. Нішто іншае, як абзьлічванае ядро на паравозах штодзённа выводзіла са строю па некалькі дзесяткаў паравозаў, выклікала шматлікія здарэньні і спазьненьні цягнікоў, чым зрывала пляны перавозак, і адбівалася на выкананьні прамфінпляну прадпрыемстваў і нават цэлых галін народнай гаспадаркі.

Праз карэнную перабудову работы ўсіх зьвеньняў чыгуначнага транспарту і ў першую чаргу яго асноўнага зьвяна — паравознай гаспадаркі — партыя вызначыла шляхі для поўнага ліквідаваньня чыгуначнага транспарту.

Ключ вырашэньня гэтай задачы — ліквідацыя абязьлічанай ядзы на паравозе і пераход на спараную.

Папярэдняя выпіскі работы сапыялістычнага транспарту за мінулы год ілюструюцца лепшым дакладам правільнасьці лініі нашай партыі і рэальнасьці бальшавіцкіх пляноў.

Досыць паказаць на тое, што на ўсім Саюзе ў студзені бягучага году чыгуначны транспарт прузіў прыкладна на 12-14 тысяч вагонаў у суткі больш, чым у студзені мінулага году.

Студзеньская здова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР паслужыла выходным пунктам ня толькі ў барацьбе з абязьлічкай на паравозе, але і ў барацьбе з абязьлічкай па ўсіх зьвеньнях транспарту, з ураўнілаўкай, з коснасьцю, бюракратызмам і г. д.

На працягу году сыстэма зарплаты на транспарце рашуча перабудавана. На аснове здзельшчыны і прэміяльна-прагрэсыўнай сыстэмы аплаты працы, вызначэньня вядучых прафэсій, на аснове пераатэставаньня пастаючай разрадкай сеткі ў прагрэсыўна-нарастаючую, была павышана чыгуначнікам зарплата і забясьпечана канчатковая перамога над ураўнілаўкай.

За год ня таксама дабіліся вялікіх поспехаў у матар'яльна-бытавым абслугоўваньні работнікаў транспарту.

На аснове рэалізацыі студзеньскай здовы ЦК і СНК, з умоў тав. Сталіна пастаноў апошніх партыйных пленумаў, чыгуначнікі БССР, як і ўсяго Саюзкага саюзу, па-бальшавіку мабілізаваліся на ператварэньне сапыялістычнага транспарту з «вузкага месца» ва ворную галіну народнай гаспадаркі.

Сярэдня-сутачны прабег таварнага паравозу на усіх 4-х эксплёатацыйных раёнах БССР у трэцім квартале 1931 г. павялічыўся да 170,0 клм. супроць 93,4 клм. у 1930 г. і 72 клм — у 1913 г.

У момант студзеньскай здовы ЦК і СНК процант хворых паравозаў на Гомельскім раёне складаў 40,7, а ў першай дэкадзе студзеня зьнізіўся да 14,8. На Жлобінскім раёне ў сакавіку 1931 г. — 32,7, а ў першай дэкадзе студзеня 1932 году — 13,77. На Аршанскім раёне ў лютым мінулага году — 23,3, а зараз — 11,03. Нават на Віцебскім раёне, дзе процант хворых паравозаў увесь час вышэй заданай нормы, ёсьць зьніжэньне з 32,7 проц. у сакавіку да 16,9 проц. у першай дэкадзе студзеня 1932 г.

Спараная ядра перамагла ў барацьбе з абязьлічкай. Крывая зрыву спараной увесь час ідзе ўніз. Калі, напрыклад, на Гомельскім эксплёатацыйным у яніўні мы мелі 206 выпадкаў зрыву, то ў першай дэкадзе студзеня 1932 г. — 8 выпадкаў. На Аршанскім раёне ў сьнежні спараная ядра была замацавана на 89,5 проц., а ў першай палове студзеня — 92,2 проц. Тое самае і па астатніх раёнах.

Паказальнікаў аб паляпшэньні работы чыгуначнага транспарту можна падаць многа.

Побач з вялізарнымі і бясспрэчнымі дасягненьнямі, мы маем яшчэ рад буйных недахопаў у рабоце чыгуначнага транспарту. Вымяральнікі па карыснай рабоце паравозаў і вагонаў, па 100 проц. сьледаваньні цягнікоў па раскладу, па якасьці рамонту і інш. да сёньняшняга дня ня выконваюцца.

Нават у другой дэкадзе студзеня бягучага году процант хворых паравозаў параўнальна з першай дэкадай узьняўся па Гомельскім раёне на 1,3 проц., па Аршанскім — на 1,21 проц., на Віцебскім — 0,8 проц. і па Жлобінскім — 0,84 проц.

Па Аршанскім, Віцебскім і Жлобінскім раёнах карысная работа паравознага і вагоннага парку не даведзена да нормы, якая прадугледжана загадам тав. Андрэева.

Толькі па адным Гомельскім раёне паравозны парк карысна працаваў: у лі стападзе—10,6 гадз. у суткі, у сьнежні — 12,6 гадз., а ў першай дэкадзе студзеня — 13,2 гадз.

Бясспрэчна, што ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі аб паваротце пізавых партыйных зьвеньняў тварам да вытворчасьці і перанясеньне цэнтру цяжару работы ў дэпо, цэхі, брыгады на паравоз і г. д. значна ўзьнялі ўдзел партарганізацыі ва ўсім гаспадарча-палітычным жыцьці транспарту, забясьпечылі далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва сярод шырокіх мас рабочых-чыгуначнікаў.

Аднак, мы павінны з усёй сілай падкрэсьліць, што партыйныя ячэйкі транспарту яшчэ і па сёньнешні дзень слаба займаюцца пытаньнем правільнага размеркаваньня партыйных сіл і нагрузак з тым, каб забясьпечыць у першую чаргу поўнае выкананьне вытворчых задач, каб вядучая роля камуністаў на вытворчасьці злучылася з іх актыўным удзелам у партыйным жыцьці і сыстэматычным павышэньнем іх марксыцка-ленінскай падрыхтоўкі.

Па Віцебскім і іншых эксплёатацыйных раёнах дырэктыва партыі аб пагаладоўным уцягненьні камуністаў і камсамольцаў у сацыялістычнае спаборніцтва ў значнай ступені засталася невыкананай. Мы маем паадзінкі выпадкі, калі на чорных дошках Віцебскага, Гомельскага і інш. вуалоў красуюцца прозьвішчы пасобных камуністаў і камсамольцаў — ілжэўдарнікаў, гультаёў, якія арываюць сваімі паводзінамі трансфінпляны і ганьбуюць сваю арганізацыю. Барацьба з ілжэўдарніцтвам праводзіцца слаба.

Зусім у пачатковым становішчы знаходзіцца справа па аўладаньні вытворчай тэхнікай. Ні партыйныя, ні прафэсіянальныя арганізацыі не разгарнулі належнай барацьбы за тэхнічную ўзброенасьць рабочых-чыгуначнікаў і кіраўнічых кадраў.

Няма сумненьня ў тым, што, на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна і апошніх пастаноў пленумаў ЦК партыі, перабудова на сацыялістычным транспарце будзе з посьпехам скончана.

Асвоіць бальшавіцкія пляны перавозак магчыма будзе толькі пры ўмове неадкладнага правядзеньня ў жыцьцё важнейшых мерапрыемстваў, якія намечаны наркомам тав. Андрэевым па ліквідацыі абязьлічкі вагоннай гаспадаркі, павышэньні выкарыстаньня рухомага складу і г. д.

Толькі ў энэргічнай барацьбе за бальшавіцкія тэмпы, толькі ў непрымірымых баёх з апартунізмам усіх масьцей партыйнае арганізацыі на транспарце павядуць армію чыгуначнага пралетарыяту БССР на выкананьне і перавыкананьне пляну заключнага году пяцігодкі.

Сіроціна перавыканала студзеньскі фінплян

ЦК КП(б)Б. СНК, НКФ БССР. „ЗЬВЯЗЬДЗЕ"

СІРОЦІНА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). У ВЫНІКУ МАБІЛІЗАЦЫІ МАС І АРГАНІЗАЦЫІ ФІНАНСАВАГА ПАХОДУ Ў ГОНАР XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б СІРОЦІНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ СТУДЗЕНЬСКІ ПЛЯН МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ ПА 101,2 ПРОЦ. РАЗГОРТВАЕМ ДРУГІ ЭТАП ФІНАНСАВАГА ПАХОДУ, ДА XVII УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ. ДАБІЦЦА 50 ПРОЦ. КВАРТАЛЬНАГА ФІНПЛЯНУ.

РАЙКОМ КП(б)Б УСЕНКА.

РАЙШТАБ РЖЭУСКІ.

Гарматныя джэрлы наведзены на Шанхай

Японскія войскі занялі зыходныя пазы цыі для атакі

Горад нагадвае ваенны лягер

ШАНХАЙ, 28. Улады міжнароднага сэтльмэнта Шанхаю абвясьцілі, пачынаючы з 4 гадзін вечара, стан аблогі. Амэрыканскія, ангельскія, японскія і інш. ваенныя сілы, якія знаходзяцца ў Шанхаі, займаюць пазыцыі ва ўсіх частках горада ў мэтах абароны ад магчымых выпадковасьцяй у часе падыходзячых шампучых ваенных сутычак». Замежныя ваенныя сілы, пяхіцыя, валантэрскі корпус мабілізаваны. Вопускі маракам замежных ваенных суднаў не выдаюцца. Ангельскі брыгадны генэрал Флемінг прызначан галоўнакамандуючым ваеннымі сіламі міжнароднага сэтльмэнта ў Шанхаі.

Японскія ваенныя ўлады паведамілі замежныя ўлады ў Шанхаі аб тым, што **заўтра раніцой японскія войскі пачнуць ваенныя дзеяньні супроць кітайскіх кварталаў.** Аднак, магчыма, што ваенныя дзеяньні пачнуцца ўжо сёньня ў поўнач. Сёньня ў 6 гадзін вечара пасьля скасаваньня тэрміну ўльтыматуму, былі даны гарматныя выстрэлы і японскія войскі занялі заходныя пункты для атакі. Японскія ўлады заяўляюць, што яны пашлюць уласныя вайсковыя часьці для закрыцьця антыяпонскіх арганізацый.

На кітайскай тэрыторыі вельмі вялікае хваляваньне, якое мяжуецца з панікай. Тысячы людзей уцякаюць у замежныя кварталы, баючыся ваенных дзеяньняў. Многія салдаты дэзэртуюць, указваючы, што «кітайская камандаваньне не дазваляе біцца з японскімі войскамі». Для нагляду пах кітайскімі войскамі, для падтрыманьня дысцыпліны, з Нанкіну прысланы 1.500 адборных салдат Чан Кай-шы. Бацца магчымасьці сутычкі паміж кітайскімі войскамі шанхайскага гарнізону і прысланымі з Нанкіну салдатамі.

Кітайскія ўлады скончылі ўсе ваенныя падрыхтаваньні. Салдаты ахоўваюць урадавыя будынкі. Флёт прыведзен у баявы парадак. Зэнітныя гарматы на-гатове. **Паступова Шанхай ператвараецца ў ваены лягер і ліхаманкава чакае падзей.** Ніхто не сумняваецца, што японцы заўтра зойм уць кітайскую частку Шанхаю, што разглядаецца, як **першы крок да далейшых дзеяньняў у Нанкіне і ў даліне ракі Яцзы.** (ТАСС).

Японскі ўльтыматум уладам Шанхаю

ШАНХАЙ, 28. Японскім генэральным консулам у Шанхаі перададзены ўльтыматум кітайскім уладам, згодна якога кітайскія ўлады павінны прынець японскія патрабаваньні да 6 гадзін вечара сёньняшняга дня. Перад атрыманьнем ультыматуму, мэр Шанхаю апублікаваў загад аб роспуску антыяпонскіх асацыяцый, матывуючы гэта тым, што дзеяньні гэтых асацыяцый «зьяўляюцца пенажаданымі». Адначасова ён адзначыў неабходнасьць пакараньня ўсіх асоб, якія не падпарадкоўваюцца загаду. Разам з тым зробленая заява аб прыняцьці японскіх патрабаваньняў, у прыватнасьці аб роспуску антыяпонскіх арганізацый выкліча абурэньне ўсяго вайскоўнай.

Амэрыка прапануе Англіі супрацоўніцтва ў Кітаі

ВАШЫНГТОН, 27. Паводле непадцьверджаных пакуль-што паведамленьняў, Злучаныя Штаты прапанавалі Англіі **ўжыць супольныя эканамічныя меры, накіраваныя супроць Японіі.** Першая мера павінна заключацца ў адмаўленьні выдаваць пашпарты і візы японскім грамадзянам. У выпадку, калі Англія згодзіцца супрацоўнічаць з Амэрыкай у гэтым напрамку, кангрэс (парлямант) ПАЗШ мог-бы потым ужыць меры па выданьні закону **аб забароне гандлю з Японіяй.**

Сёньня днём Стымсон гутарыў з ангельскім паслом Ліндсэем. «Нью-Ёрк ізінінг пост» паведамляе з Лёндану, што ангельскі ўрад атрымаў амэрыканскую прапанову па пытаньні аб Шанхаі, зазначаючы, што прапанова гэта відавочна зьяўляецца надзвычай важнай, хоці невядома, якога яна характару.

Газэта далей піша: «Магчыма, што прапанова ідзе значна далей просьбы аб супольных англа-амэрыканскіх дзеяньнях у адносінах Японіі».

Актыяпонскія таварыствы супроць загаду аб сваім роспуску

ТОКІЯ, 28. Японскія морскія ўлады лічаць няўхільным узьнікненьне буйнага інцыдэнту ў Шанхаі. Паводле паведамленьня агенцтва Сінбун Рэнга і Дэмпа Цусін з Шанхаю, японскія морскія ўлады мяркуюць, што адказ кітайскіх улад, які чакаецца сёньня, будзе мець фармальнае задавальненьне ўсіх японскіх патрабаваньняў, на справе-ж кітайскія ўлады нічога ня ўжываюць і ня хочуць ужываць, а толькі выгрываюць час. Таму японскія морскія ўлады пастанавілі ўжыць сілу і распусьціць антыяпонскія таварыствы. **Антыяпонскія таварыствы парашылі не падпарадкавацца магчымаму загаду ўраду аб роспуску і хочуць адказаць на загад узмацненьнем антыяпонскага руху.** Такія-ж весткі атрыманы з **Цьндао.**

Трывога амэрыканскай буржуазіі

ВАШЫНГТОН, 28. Дзяржаўны сакратар (міністар замежных спраў) Стымсон адмовіўся пацьвердзіць ці абвергнуць чуткі аб тым, што **морскія флёты Англіі і ПАЗШ рыхтуюць супольныя дзеяньні ў Шанхаі.** У колах міністэрства замежных спраў выказваецца **сур'ёзны непакой у сувязі са становішчам у Шанхаі.** Паводле паведамленьня «Асошыэйтэд Прэс», Стымсон разглядае пытаньне аб прыняцьці больш цьвёрдых захадаў, чым па гэтага часу. Стымсон перадаў сэнату ўсю неапублікаваную афіцыяльную перапіску з Японіяй па пытаньні аб Манчжурыі. Матар'ялы гэтыя будуць у хуткім часе апублікаваны.

«Асошыэйтэд Прэс» паведамляе з Манілы (галоўны горад Філіпінскіх выспаў), што паводле чутак, **сканцэнтраваныя зараз ля Манілы ваенна-морскія сілы ПАЗШ у азіяцкіх водах рыхтуюцца да адпраўкі з Манілы ў напрамку да Шанхаю.** (ТАСС).

Тэзісы другой пяцігодкі—у цэнтры ўвагі прэсы ўсяго сьвету

ВОДГУКІ ФРАНЦУСКАЙ ПРЭСЫ

ПАРЫЖ, 27. У сувязі з апублікаваньнем дырэктыў да складаньня другой пяцігодкі, **«Тан»** спыняецца на пытаньні аб магчымасьці незалежнай эканомікі СССР і лічыць немагчымым, каб СССР мог адмовіцца ад увозу спэцыялістаў, бо для таго, каб умець карыстацца пабудаванымі чужаземцамі заводамі, неабходна доўгагадовае выхаваньне мас. «Тан» прызнае, што СССР удалося перамагчы на першым этапе індустрыялізацыі без дапамогі замежнай пазыкі і ставіць пытаньне, ці ўдасца гэта СССР на другім этапе.

«Авэнір» падкрэсьлівае важнасьць, якая надаецца плянам разьвіцьця чыгуначнай сеткі дробнага гандлю і таму факту, што дырэктыва абвяргае як «лявацкі» лёзунг, пераход да простага тавараабмену. «Авэнір» адзначае, што ў той час, як да цяперашняга моманту асноўнае ў савецкай эканоміцы заключалася ва ўзьняцьці цяжкай індустрыі, зараз відавочна больш думаюць аб дабрабыце мас.

Пяцігодка—гэта новы волат—

гаворыць аўстрыйская прэса

ВЕНА, 27. Сёньняшняя **«Нэйе Фрэйнз Прэсса»** прысьвячае перадавы артыкул пад загалоўкам «Сэнсацыйныя весткі аб памерах Расіі» — другой пяцігодцы. Газэта патрабуе ў гэтым артыкуле перагляду адносін да падзей у Савецкім Саюзе, заяўляючы аб «необходнасьці браць урокі з савецкага вопыту». Гаворачы аб мэтадах пяцігодкі, газэта далей піша:

«Нельга з засьмешкай адмоўчваць ад палобных мэтадаў канцэнтрацыі ўсёй энэргіі». Пералічваючы заданьні пяцігодкі, газэта далей піша:

«Амаль трацін дыханьне пры пералічэньні гэтых галавакружальных лічбаў. Новая пяцігодка хоча ня больш, чым менш, як адкрыць новую вобласьць у тры разы большую, чым уся Эўропа без СССР, а іменна азіяцкія і арктычныя вобласьці Савецкага Саюзу.

Газэта заяўляе, што «Эўропа павінна абмеркаваць значэньне расійскай самаізаляцыі (Аўтаркі) для эўрапейскай вытворчасьці, асьцярагаючыся пры гэтым у далейшым новых зьяўішч, якія прынясуць яшчэ больш сур'ёзны зварот, чым да гэтага часу. СССР прасьледуе цяпер мірную палітыку ў адносінах да сваіх непасрэдных суседзяў. Яна заключыла з Польшчай і Фінляндыяй пакты аб ненападзе. Можа быць заўтра ёй удасца адналіць нармальныя адносіны з Францыяй. Бальшавізм можна спраклінаць, але яго трэба вывучаць. **Пяцігодка — гэта новы волат,** які неабходна прымаць пад увагу і ва ўсім выпадку ў гаспадарчы разрахунак. (ТАСС).

Гіганцкія лосьпехі сацыялістычнага будаўніцтва выклікаюць трывогу ў буржуазіі

БЭРЛІН, 27. Апублікаваныя тэзісы дырэктыў па складаньні другой пяцігодкі натуральна прыцягваюць увагу ўсяго буржуазнага друку, які прабуе ўтаіць сваю трывогу з прычыны гіганцкіх посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР злобнымі і ілжывымі антысавецкімі выпадамі. «Бэрлінэр Бэрзэн Кур'ер» прызнаючы, што «ханя з часу складаньня першай пяцігодкі дасягнуты вялікія посьпехі», прабуе заяўляць сваіх чытачоў у «неажыцьцяўлоўныя фантастычных мэтадаў», пастаўленых Савецкім Саюзам. Орган германскіх каталіцкіх прафсаюзаў «Дэр дэйчэ» прабуе ганьбіць сацыялістычнае будаўніцтва бязглуздым дасьпяваньнем, што ў СССР «да гэтага часу не дасягнуты матар'яльныя посьпехі». (ТАСС).

КРУТА ЎЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ ЛЕСАЗАГАТОВАК

Прымусіць кулака поўнасьцю выканаць цьвёрдыя заданьні па вывазцы лесу

Патрэбен карэнны пералом

Тэмпы лесазагатовак па БССР застаюцца недапушчальна нізкімі.

КВАРТАЛЬНЫ ПЛЯН НА 25 СТУДЗЕНЯ ВЫКАНАН ПА ЗАГАТОЎЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ НА 33,5 ПРОЦ., ДРОЎ — НА 25,9 ПРОЦ. Асабліва сур'ёзнае становішча з вывазкай. КВАРТАЛЬНЫ ПЛЯН НА 25 СТУДЗЕНЯ ПА ВЫВАЗЦЫ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ ВЫКАНАН УСЯГО НА 10,1 ПРОЦ., ДРОЎ — НА 17,3 ПРОЦ. Пятая пяцідзёўка студзеня дала зусім нязначны прырост: па вывазцы матар'ялаў — на 1,9 проц., дроў — на 2,2 проц.

Тлумачыцца гэта, перш за ўсё, тым, што ў частцы раёнаў па-ранейшаму НЕ АДДАЕЦЦА НАЛЕЖНАЯ УВАГІ РАЗГОРТВАНЬНЮ МАСАВАЙ РАБОТЫ ВАКОЛ ЛЕСАЗАГАТОВАК, па-ранейшаму не мабілізуюцца калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы вёсак важнасьці пытаньня бесьперабойнага забясьпячэньня дрэваапрацоўчай прамысловасьці сырцом і пралетарскіх цэнтраў апалам, на лясных работах зусім слаба ажыцьцяўляюцца шасьць умоў ТАВ. СТАЛІНА. У РАДЗЕ РАЁНАЎ НЯМА НАЛЕЖНАГА НАЦІСКУ НА КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫЯ ГАСПАДАРКІ. Аб гэтым сьведчаць хаця-б факты невыкананьня кулакамі цьвёрдых заданьняў у Кармянскім, Заслаўскім, Крычаўскім і інш. раёнах.

Удзел калгаснага сэктару ў лесазагатоўчай кампаніі невыстарчальны. Замест 65.000 фурманак, якія павінны выяжджаць штодзённа, калгасны сэктар высылае толькі 18.200.

Такое становішча патрабуе ад усіх партыйных раённых арганізацый карэннага перапому ў рабоце і максымальнай увагі гэтаму адказнаму вучастку.

Толькі ў барацьбе з апартуністычнымі элемэнтамі, шырока разгортваючы масавую работу вакол лесазагатовак і вывазкі, шпахам мабілізацыі мас на барацьбу за бесьперабойнае забясьпячэньне дрэваапрацоўчай прамысловасьці сырцом і пралетарскіх цэнтраў апалам, на аснове ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў т. Сталіна і рашучага націску на кулацка-заможныя гаспадаркі, — можа забясьпечыць пасьпяховае выкананьне лесазагатовак і вывазкі.

Аб удзеле калгасаў у лесазагатоўках і лесавывазцы

З пастановы праўленьня Калгасцэнтру БССР, 29 студзеня 1932 году

Удзел калгасаў у лесазагатоўках і лесавывазках зьяўляецца яўна недавальняючым. Замест 65 тыс. фурманак, якія павінны штодзённа вывозіць лес, вывозяць толькі 18.200, што пагражае зрывам выкананьня пляну лесазагатовак.

У радзе раёнаў і калгасаў устаноўлены вельмі высокія адлічэньні ад заработкаў калгасьнікаў у карысьць калгасаў.

Слаба, папырана практыка арганізацыі брыгад лесавозаў і арганізаваны выезд на лесавывазкі брыгадамі. Надта слаба праводзіцца работа на заключэньні дагавораў з леспрамгасамі на лесавывазку, пагляцаюцца частыя выпадкі парушэньня гэтых дагавораў з боку калгасаў.

У мэтах забясьпячэньня большага ўдзелу калгасаў у лесазагатоўках і лесавывазках, праўленьне Калгасцэнтру пастанаўляе:

1. Абавязаць праўленьні калгасаў арганізаваць спэцыяльныя брыгады па лесавывазцы з ліку лепшых калгасьнікаў-ударнікаў. Кіраўніцтва работай гэтых брыгад ускласьці на аднаго з членаў праўленьня, які павінен разам з брыгадай выяжджаць на работу па вывазцы лесу.

2. У адпаведнасьці ранейшых указаньняў аб разьмерах адлічэньняў ад заработку калгасьнікаў на лесазагатоўках і лесавывазках, прапанаваць праўленьням калгасаюзаў і калгасаў: а) не дапускаць нізкіх адлічэньняў ад заработкаў калгасьнікаў пры рабоце без каня. Увесь заработак калгасьніка пры рабоце без каня цалкам паступае ў яго распараджэньне, б) устанавіць адлічэньні ад заработку калгасьнікаў па вывазцы лесу на калгасных конях ня вышэй 3 проц. ад заработку, калі калгасьнік забясьпечвае каня сваімі жарамі і ня вышэй 25 проц., калі калгасьнік карыстаецца кармамі калгасаў.

Разьлік з калгасьнікамі павінен праводзіцца выключна непасрэдна лесапрамгасамі. Калгасьнікі атрымліваюць самі ў леспрамгасах усю зароблену імі суму прошай і робяць самі адлічэньні ад свайго заработку ў карысьць калгасу, згодна ўстаноўленага вышэй парадку.

Кадэтарычна забараніць калгасам праводзіць разьлік з калгасьнікамі за работу на лесазагатоўках прададзьмі.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру БССР МІЦЬКОЎ.

Забясьпечыць сырцом бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат

Адкрыты ліст рабочых бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату

Пад кіраўніцтвам партарганізацыі, на аснове рэалізацыі 6 гістарычных указаньняў т. Сталіна, 5-цітысячны калектыў бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату рашуча стаў на шлях поўнай ліквідацыі недавыкананьня вытворчай праграмы.

Барацьбой з абязьлічкай і ўраўнілаўкай, разгортваньнем сацыялістычных мэтадаў працы — сацпаборніцтва і ўдарніцтва, — укараненьнем гаспадарчага разрахунку ў цэхах і брыгадах мы дабіліся выкананьня вытворчай праграмы за першую дэкаду студзеня: па болдроўцэху на 112,4 проц., экспартнай — на 136,7 проц., па стандартным цэху — на 115,3 проц., па лесацэху — на 104,9 проц., па лесазаводзе № 7 — на 97,3 проц., па лесазаводзе № 6 — на 92,4 проц. па фанэрным цэху — 70,6 проц.

Мы абавязаліся перад партыяй і ўсёй пралетарскай грамадзкасьцю замацаваць і пашырыць нашы дасягненьні